




# МЕДЫЯКЛАС

практыкаванні, урокі, класныя і інфармацыйныя гадзіны

## Дапаможнік
## для настаўнікаў
## беларускай мовы і літаратуры

**МедыяКЛАС: практыкаванні, урокі, класныя і інфармацыйныя гадзіны.**
**Дапаможнік для настаўнікаў і трэнераў**

**Аўтары дапаможніка – настаўнікі і медыяпедагогі – прапануюць актуальныя па тэматыцы і апрабаваныя на практыцы матэрыялы для развіцця крытычнага мыслення як асновы фарміравання медыяінфармацыйных кампетэнцый вучняў і дарослых. Матэрыялы прадстаўлены ў выглядзе практыкаванняў, распрацовак урокаў і пазакласных мерапрыемстваў, модуляў трэнінгаў для школьнікаў і дарослых.**

**Кніга будзе карыснай настаўнікам, трэнерам, класным кіраўнікам, бацькам, выхавальнікам, метадыстам і выкладчыкам устаноў дадатковай адукацыі, педагагічных каледжаў і ўніверсітэтаў.**

© Nastaunik.info

Гэта кніга з практыкаваннямі для развіцця крытычнага мыслення і медыяграматнасці з'явілася як адказ настаўнікаў-практыкаў на выклікі 2020-2021 гадоў, якія карэнным чынам мяняюць адукацыю. Стала відавочна, што праблемы пандэміі Covid-19, інфармацыйных войнаў, выбуху сацыяльных медыя – гэта і праблемы адукацыі, у тым ліку і медыяадукацыі.

У час пандэміі каранавіруса стала зразумела, што наша школа не падрыхтавана да дыстанцыйнай формы навучання, але яшчэ горш, што базавыя школьныя веды аказаліся настолькі слабымі і састарэлымі, што нават не ўсе выдатнікі ў стане працаваць з першакрыніцамі інфармацыі. Напрыклад, яны няздольныя самастойна разабрацца, што такое вірус, зразумець яго прыроду, шляхі распаўсюджвання, механізм дзеяння вакцын. Натуральная рэакцыя перад невядомым — страх. Менавіта з-за хібаў нашай адукацыі людзі не змаглі крытычна ацаніць інфармацыю, якая з'яўлялася ў медыя, і паддаваліся паніцы або верылі фэйкам і чуткам.

Медыя падчас пандэміі таксама паказалі сваю некампетэнтнасць і нежаданне прытрымлівацца журналісцкіх стандартаў. Адны СМІ транслявалі канспіралагічныя тэорыі, пісалі, што пандэміі наогул няма, маніпулявалі лічбамі і фактамі. Іншыя — публікавалі «страшылкі», мелі перадазіроўку негатыву, недахоп узважанай экспертнай ацэнкі. Беларусы апынуліся ў пастцы паміж двух медыйных пазіцый: панікай і ігнараваннем. Мы сутыкнуліся са з'явай постпраўды — калі людзі шукалі ў медыя не факты, а пацверджанне сваім эмоцыям і ўстаноўкам, якія сфарміравалі СМІ.  Дзіўна, але пандэмія не выклікала ў людзей імкнення да масавай самаадукацыі і жадання разабрацца ў праблеме. Аб'ектыўная інфармацыя была незапатрабаваная. І гэта таксама  сведчыць пра нізкі ўзровень медыяпісьменнасці і агульнай адукаванасці, якія павінна забяспечваць школа.

З-за ангажаванасці СМІ актывізаваліся сацыяльныя сеткі, вялікі ўплыў на грамадскую думку пачалі аказваць блогеры і тэлеграм-каналы. Але і там хапае дэзынфармацыі, прапаганды і  агрэсіі. Мы зноў бачым тыповы эфект, які сацыёлаг Ноэль Нойман назвала "пятля маўчання". Калі школа і медыя перастаюць выконваць сваю функцыю — быць крыніцай ведаў і каналамі аб'ектыўнага асвятлення рэчаіснасці,  — у  грамадстве  ствараецца сітуацыя, калі людзі, пазіцыя якіх замоўчваецца, — замаўкаюць. Яны думаюць, што яны ў меншасці, хаця іх можа быць большасць. Мы сутыкнуліся з такой з'явай у выпадку распаўсюджвання каранавірусу. Людзі з узважанай навукова-абгрунтаванай пазіцыяй замоўклі, у пятлю якраз патрапіла навуковая карціна свету.

Настаўнікі Беларусі адчуваюць выклікі інфармацыйнага грамадства, аднак разглядаюць іх не як пагрозу, а як штуршок да развіцця адукацыі.

Мы шмат чулі ад бацькоў, настаўнікаў ды і з высокіх трыбун, што адукацыя павінна адпавядаць патрэбам людзей: для працы, для самарэалізацыі, для актыўнага грамадзянства, для захавання здароўя. Больш за тое, вынікі апошняга даследавання PISA — аднаго з аўтарытэтных у свеце даследаванняў падрыхтаванасці вучняў сярэдніх школ да жыцця ў сучасным інфармацыйным грамадстве — паказалі, што толькі 9% навучэнцаў у даследаваных краінах здольны знаходзіць парушэнне логікі і выяўляць адрозненні паміж фактам і меркаваннем, абапіраючыся на няяўныя падказкі, якія тычацца зместу альбо крыніцы інфармацыі. У Беларусі гэты паказчык яшчэ меншы — толькі 4% навучэнцаў прадэманстравалі здольнасці крытычнай ацэнкі інфармацыі. У век інфармацыйных тэхналогій такое недапушчальна, бо наступнае пакаленне не зможа арыентавацца ў патоку інфармацыі, рабіць высновы, прымаць адказныя рашэнні, быць канкурэнтным на рынку працы. Дапамагчы вырашэнню гэтай праблемы можа інтэграцыя ў школьныя прадметы медыяпісьменнасці вучняў, навучанне іх крытычнаму мысленню на прыкладзе сродкаў медыя.

Менавіта з гэтай мэтай настаўнікі вывучалі замежны і беларускі досвед інтэграцыі медыя ў навучальны працэс, укаранялі найлепшыя практыкі ў сваю педагагічную дзейнасць. Настаўнікі ўбачылі, што пры гэтым не толькі павышаецца матывацыя вучняў да навучання, бо яны атрымліваюць актуальны змест па вучэбным прадмеце, але і фарміруюцца іх медыяінфармацыйныя кампетэнцыі, неабходныя для жыцця ў інфармацыйным свеце. У выніку настаўнікі стварылі MediaToolkit — электронны банк практыкаванняў для развіцця медыяпісьменнасці. У яго ўвайшлі практыкаванні, якія дапамагаюць настаўнікам на прыкладзе медыятэкстаў патлумачыць вучням змест урока, а разам з тым даюць адказ на шмат іншых пытанняў. Як адрозніць фэйк ад праўды? Як праверыць надзейнасць крыніц інфармацыі? Ці можна давяраць рэкламе? Чаму адна і тая ж падзея выклікае розную рэакцыю ў людзей? Што рабіць, калі цябе тролять? Як не заблытацца ў сацыяльных сетках і не стаць ахвярай кібербулінгу?

Гэта кніга-мануал — толькі невялікая частка практыкаванняў, прысвечана пандэміі каранавіруса і іншым самым актуальным падзеям, якія ўлічваюць новыя тэндэнцыі і медыйныя тэхналогіі. Кніга змяшчае практыкаванні для ўрокаў і гатовыя інфармацыйныя і класныя гадзіны, выхаваўчыя заняткі і элементы трэнінгаў для дарослых.

Дапаможнік адрасаваны настаўнікам, трэнерам, класным кіраўнікам, педагогам дадатковай адукацыі, якія імкнуцца разнастаіць свае заняткі, зрабіць іх больш цікавымі для вучняў. Мы павінны памятаць, што школа і медыя фарміруюць масавую свядомасць. Школа закладвае карціну свету. У ідэале — гэта навуковая карціна свету з сістэмнымі ведамі, навыкамі крытычнага мыслення і разуменнем сябе ў гэтым свеце. Заклікаем далучацца да агульнай справы, рабіць нашу школу сучаснай, канкурэнтнай і беларускай.

Карыстайцеся MediaToolkit — гатовай скарбонкай практыкаванняў і ўрокаў з медыяадукацыйным зместам: **http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/**

Дасылайце вашы новыя практыкаванні і прапановы на адрас: **nastaunik.info@gmail.com.**

Сачыце за навінамі на сайце nastaunik.info і ў суполцы ў Facebook «Медыяадукатар»:
**https://www.facebook.com/groups/medyaadukatar/**

## ЯК КАРЫСТАЦЦА ДАПАМОЖНІКАМ

Гэты метадычны дапаможнік складаецца з гатовых практыкаванняў, сцэнарыяў урокаў, інфармацыйных  і класных гадзін, якія дазваляюць вам, як настаўнікам:

• планаваць вучэбныя заняткі з медыяадукацыйным зместам па тэме свайго ўрока;

• абмяркоўваць і планаваць стварэнне атмасферы ў класе, якая б спрыяла ўсведамленню вучнямі пераваг і небяспекі інфармацыйнага свету, разуменню ролі медыя ў грамадстве, адказнаму стаўленню да аўтарскіх правоў, свабоды слова;

• узмацняць і пашыраць актыўны і адказны ўдзел вучняў і дарослых у стварэнні інфармацыйнай прасторы.

**Як знайсці патрэбнае практыкаванне?**

Матэрыялы дапаможніка арыентаваны найперш на настаўнікаў сярэдняй школы. Кожнае практыкаванне (урок) мае ў загалоўку назву,  пералік медыякампетэнцый, фарміраванню якіх яно спрыяе, клас, прадмет, прыкладны час, патрэбны для яго правядзення, пералік скарыстаных  метадаў і матэрыялаў для падрыхтоўкі.

Абсалютная большасць практыкаванняў з’яўляюцца ўніверсальнымі і могуць быць выкарыстаны як элементы трэнінгаў і семінараў па медыяпісьменнасці, выхаваўчых, навучальных і забаўляльных мерапрыемстваў для розных мэтавых груп.

## ТЫПЫ ПРАКТЫКАВАННЯЎ



Групавая работа | Індывідуальная работа | Дэбаты | Дыскусія, абмеркаванне



Мазгавы штурм | Праект | Кейсы | Гульня | Перакулены клас

**Медыяінфармацыйныя кампетэнцыі**

Усе метадычныя распрацоўкі і практыкаванні кнігі арыентаваны на фарміраванне медыя-інфармацыйных кампетэнцый іх удзельнікаў, якія адлюстраваны ў прыкладнай мадэлі выпускніка школы.

# МАДЭЛЬ ВУЧНЯ

МЕДЫЯ-ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ КАМПЕТЭНЦЫІ ВЫПУСКНІКА ШКОЛЫ

1



**ВЕДЫ**

- разуменне ролі СМІ іх уплыву на асобу і грамадства;
- базавыя веды пра тэхналогіі інфармацыйнага грамадства, якія забяспечваюць доступ і інтэрактыўныя зносіны ў інфармацыйнай прасторы, магчымасці адбору, метады праверкі надзейнасці крыніц;
- веды пра бяспеку, магчымасці і патэнцыйныя рызыкі інтэрнэту для асабістага жыцця, камунікацыі, навучання, даследаванняў, працы і грамадскіх зносін;
- веданне прававых і этычных норм інтэрактыўнага карыстання інфармацыйнымі тэхналогіямі.

2



**УМЕННІ**

- здольнасць пошуку, адбору і апрацоўкі інфармацыі, а таксама інтэрактыўнага ўзаемадзеяння з медыя;
- уменні дэкадавання медыяпаведамленняў, іх крытычнай ацэнкі, распазнавання няпраўды і маніпуляцыйных прыёмаў;
- навыкі карыстання паслугамі інтэрнэту, інструментамі для вытворчасці ўласных медыяпрадуктаў і іх прэзентацыі.

3




**КАШТОЎНАСНЫЯ ЎСТАНОЎКІ**

- крытычнае і рэфлексіўнае стаўленне да даступнай інфармацыі,
- адказнае і этычнае карыстанне інтэрактыўнымі сродкамі і інфармацыйнымі тэхналогіямі;
- павага да аўтарскіх правоў;
- адстойванне  асноўных правоў і свабод,
- усведамленне сваёй беларускай нацыянальна-моўнай і еўраатлантычнай цывілізацыйнай ідэнтычнасці;
- імкненне актыўна карыстацца і ствараць інфармацыйную прастору для культурных, сацыяльных, навучальных і/ці прафесійных мэт.

## МЭТЫ НАВУЧАННЯ Ў МЕЖАХ ПРАКТЫКАВАННЯЎ ПА ТЭМАХ

| РАЗДЗЕЛ | ВЕДЫ | НАВЫКІ | КАШТОЎНАСЦІ |
|---|---|---|---|
| Інфадэмія ў час пандэміі | Прырода вірусаў, прычыны пандэміі і інфадэміі, механізм дзеяння прышчэпак, уплыў СМІ на асобу і грамадства. | Здольнасць адшукаць праўдзівую інфармацыю, адрозніць факт ад меркавання, ацэнка медыякрыніц. | Важнасць здароўя, адказнасць за сваё здароўе, імкненне даведацца праўду, усведамленне важнасці навуковай абгрунтаванасці інфармацыі. |
| Пошук і праверка інфармацыі | Факты і меркаванні, крыніцы інфармацыі і іх надзейнасць, першакрыніцы, дэзынфармацыя і фэйкі, мова медыя. | Уменне адшукаць патрэбную інфармацыю з выкарыстаннем сучасных тэхналогій і медыякрыніц, здольнасць ацаніць надзейнасць крыніцы інфармацыі, адрозніць факты ад меркаванняў і дапушчэнняў. | Павага да ісціны, імкненне да пошуку праўдзівай інфармацыі, дапытлівасць, адказнае стаўленне да інфармацыйнай бяспекі, недапушчэнне распаўсюджвання фэйкаў. |
| Аналіз і ацэнка медыятэкстаў | Мова медыя, роля і ўплыў медыя на асобу і грамадства, рэклама, прапаганда, маніпуляцыі, этыка і журналісцкія стандарты. | Дэкадаванне медыятэкстаў, крытычная ацэнка, распазнаванне няпраўды і маніпуляцыйных прыёмаў. | Крытычнае і рэфлексіўнае стаўленне да даступнай інфармацыі, цікавасць да этычных пытанняў і павага як да бяспекі, так і да ўстойлівага развіцця з пункту гледжання сваіх асабістых, сямейных, нацыянальных і глабальных інтарэсаў. |
| Стварэнне медыятэкстаў | Тэхналогіі стварэння медыятэкстаў, жанры медыя, свабода слова, аўтарскія правы, этычныя нормы карыстання медыяпрасторай. | Стварэнне, апрацоўка, прэзентацыя тэкставай, графічнай, відэа- і аўдыя- інфармацыі. | Адказнае карыстанне тэхналогіямі стварэння, апрацоўкі і распаўсюджвання інфармацыі. Захаванне этычных норм, аўтарскіх правоў. |
| Новыя медыя: магчымасці для навучання | Сацыяльныя сеткі, месенджары, тэлеграм-каналы, чаты, боты. Тэхналогіі новых медыя, прычыны іх хуткага развіцця, перавагі і небяспекі; тролінг, кібербулінг. | Здольнасць інтэрактыўнага ўзаемадзеяння ў інфармацыйнай прасторы. | Цікавасць і далучэнне да спраў супольнасцяў і сетак з адукацыйнымі, культурнымі, сацыяльнымі і прафесійнымі мэтамі. |
| Развіццё медыякампетэнцый на ўроках | Планаванне ўрока, інтэграцыя медыя ў навучальны працэс. Медыя-інфармацыйныя кампетэнцыі. | Уменне планаваць урок з медыяадукацыйным зместам, каб ён не перашкаджаў набыццю прадметных ведаў. | Усведамленне каштоўнасці медыяадукацыі, унутраная патрэба ў развіцці. |

## ТЭКСТЫ ДЛЯ РАЗДРУКОЎКІ, ВІДЭА І ІНШЫЯ ДАПАМОЖНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

Кожнае практыкаванне, матэрыял для раздрукоўкі, артыкул, відэа- і аўдыядадатак вы можаце знайсці ў электроннай форме на платформе медыятулкіт па адпаведных QR-кодах або актыўных спасылках у PDF версіі кнігі.

# Каранавірус ці каронавірус?

| #МЕДЫЯ | ЧАС | ПРАДМЕТ | КЛАС | ТЭМА | ПАДРЫХТОЎКА | ТУЛКІТ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Пошук інфармацыі, мова медыя | 30 хвілін | Беларуская мова | 6-11 | Правапіс складаных назоўнікаў | Раздаткі інфаграфікі | |

**МЭТА**

Удзельнікі прааналізуюць інфаграфіку па правілах бяспекі пры пандэміі каранавіруса, знойдуць разыходжанні падачы інфармацыі ў розных СМІ, вызначаць найбольш важныя парады і аргументуюць свой выбар, навучацца правільна пісаць слова «каранавірус», абапіраючыся на правіла правапісу складаных назоўнікаў.



## 1. РАБОТА З КЛЮЧАВЫМ ПЫТАННЕМ

Настаўнік запытваецца ў вучняў: «Як правільна па-беларуску: карАнавірус ці карОнавірус?». Прапануе знайсці інфармацыю ў інтэрнэце. Пры пошуку ў інтэрнэце (ці на падрыхтаваных прыкладах, калі няма тэхнічнай магчымасці зрабіць пошук) навучэнцы бачаць, што розныя СМІ выкарыстоўваюць рознае напісанне гэтага слова. Настаўнік запытваецца: «Да чаго нам трэба звярнуцца, каб вызначыць правільны варыянт правапісу гэтага слова?» Вучні агучваюць свае версіі (мазгавы штурм). Настаўнік фіксуе версіі і  гаворыць, што дакладны адказ на пытанне будзе дадзены ў канцы ўрока.

## 2. ПЕРАКЛАД ІНФАГРАФІКІ

Вучні атрымліваюць заданне перакласці на беларускую мову інфаграфіку БелТА пра асноўныя сімптомы і меры перасцярогі ад карА(О)навіруса (можна па групах, можна індывідуальна).

Крытэрыі ацэнкі да перакладу:

1. Звярну ўвагу на пераклад абрэвіятур
2. Звярну ўвагу на тое, як па-беларуску гучаць паняцці і тэрміны, звязаныя з медыцынай.

## 3. ПАРАЎНАННЕ ПЕРАКЛАДУ

Пасля перакладу вучні атрымліваюць беларускамоўны варыянт інфаграфікі БелТА, супастаўляюць з уласным перакладам і ўдакладняюць у настаўніка правільнасць перакладу таго ці іншага слова.
Падказка ад настаўніка: каб адказаць на пастаўленае ў пачатку пытанне, трэба ўспомніць правіла напісання хаця б гэтых двух слоў: «чАрнавокі» і «чОрнавалосы» (напісанне складаных назоўнікаў).
Што гэта за правіла і як правільна пісаць агучанае ў пачатку ўрока слова? (КарАнавірус).

## 4. РАНЖЫР РЭКАМЕНДАЦЫЙ

Напрыканцы настаўнік прапануе праранжыраваць рэкамендацыі па мерах перасцярогі ад каранавіруса ад найбольш важнай да найменш важнай і патлумачыць свой выбар.







## ПАРАДЫ НАСТАЎНІКУ

- Пры выкананні практыкавання вучні могуць карыстацца электроннымі перакладчыкамі ці электроннымі слоўнікамі.

## АЎТАР

- **Юрась Каласоўскі**

# Аргументавана пра Covid-19

| #МЕДЫЯ | ЧАС | ПРАДМЕТ | КЛАС | ТЭМА | ПАДРЫХТОЎКА | ТУЛКІТ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Ацэнка інфармацыі, стварэнне тэксту | 90 хвілін | Трэнінг | 7-11, дарослыя | Аргумент | Доступ да інтэрнэту, аркушы паперы | |

**МЭТА**

Удзельнікі будуць ведаць структуру аргумента і логіку яго выбудоўвання;
змогуць аргументавана і пераканаўча выказацца па праблеме Covid-19;
на падставе аналізу розных сайтаў і ведання структуры аргумента змогуць стварыць медыяпаведамленне.

## 1. ВЫКЛІК

**Трэнер:**
Адным з важных уменняў медыяпісьменнага чалавека з'яўляецца уменне падбіраць важкія аргументы ў абарону сваёй пазіцыі, бачыць і ацэньваць якасць аргументаў у медыятэкстах для таго, каб прыняць адказныя рашэнні.

**Трэнер:**
Пара ўнайце два выказванні:
1. Абараніцца ад захворвання на ковід можна, націраючы скуру кунжутным алеем;
2. Знішчыць вірус на паверхні прадметаў паводле Сусветнай арганізацыі аховы здароўя можна пры апрацоўцы іх некаторымі хімічнымі рэчывамі, сродкамі дэзынфекцыі на аснове хлору, эфірнымі растваральнікамі, растворамі 75% спірта.

Якія асноўныя элементы, на Ваш погляд, павінна ўтрымліваць аргументаванае выказванне? Якія фактары ўплываюць на павышэнне ўзроўню аргументацыі? (канкрэтныя факты, даследванні, эксперты ў гэтай галіне, уплывовыя арганізацыі…)

**Метад «Мазгавы штурм»:**

У якім з двух варыянтаў утрымліваюцца элементы аргументаванага выказвання? Назавіце іх.
(Трэнер запісвае на дошцы).

Пасля ўдзельнікі абмяркоўваюць гэтыя элементы і робяць выснову.

Такім чынам, пошук аргументаў і іх ацэнка дазваляюць зрабіць выснову аб праўдзівасці інфармацыі.

## 2. АСЭНСАВАННЕ

**Міні-лекцыя па структуры аргумента.**
Трэнер тлумачыць, што такое аргумент і яго структура.
**Аргумент** — гэта сцвярджэнне, з дапамогай якога вылучаецца ідэя, правільная пабудова якога дапамагае пераканаць у правільнасці ідэі.
Аргумент будуецца па сістэме. **ЗТПЗ** — заява, тлумачэнне, падтрымка, заключэнне.
**Заява** — вылучаецца ідэя, думка.
**Тлумачэнне** — даецца тлумачэнне заявы, якое пачынаецца са слоў «таму, што ...»

**Падтрымка** — доказы заявы ў выглядзе фактаў, цытат першакрыніц, статыстычных дадзеных, меркаванняў экспертаў у гэтай галіне, з дапамогай логікі.
**Заключэнне** — выснова. Звычайна пачынаецца са слоў «такім чынам», «робячы выснову», і ў канцы абавязкова паўтараецца заява.
Напрыклад,
З: Я не пайду ў кафэ на сустрэчу з аднакласнікамі.
Т: Падчас пандэміі гэта небяспечна.
П: За суткі (дадзеныя Міністэрства аховы здароўя на 13.03.2021) у Рэспубліцы Беларусь зарэгістраваныя 1 тыс. 182 пацыенты з COVID-19, таму Міністэрства аховы здароўя рэкамендуе не выходзіць з дому і не сустракацца з іншымі людзьмі без жыццёва важнай неабходнасці; адкласці святкаванні дзён нараджэння і іншых святаў.
З: Такім чынам, каб не захварэць, я не пайду на сустрэчу ў кафэ.

## 3. РАБОТА Ў ГРУПАХ

Удзельнікі трэнінгу дзеляцца на мікрагрупы. Кожнай групе трэнер прапануе тэмы для фармулявання аргументаваных выказванняў:
**Група 1:** Узбуджальнікам COVID-19 з'яўляецца вірус. НЕ бактэрыя.
**Група 2:** Інтэрнэт-крыніцы, артыкулы пра каранавірус і яго штамы неабходна правяраць (як і любую інфармацыю).
**Група 3:** Ужыванне алкаголю не абараняе ад COVID-19 і можа быць небяспечным.
**Група 4:** Удыханне пароў хлору або ўвядзенне ў арганізм іншых дэзынфектантаў не абараняе ад COVID-19 і можа быць небяспечным.
**Група 5:** Заражэнне новай каранавіруснай інфекцыяй не азначае, што чалавек становіцца пажыццёвым носьбітам віруса.

**ДЛЯ ПОШУКУ АРГУМЕНТАЎ МОЖНА ПРАПАНАВАЦЬ РЭСУРСЫ:**

## 4. ПРЭЗЕНТАЦЫЯ І АЦЭНКА АРГУМЕНТАВАНЫХ ВЫКАЗВАННЯЎ

Удзельнікі зачытваюць свае аргументы.
Узаемаацэнка па крытэрыях:
Ці была выразна сфармулявана думка? ( Заяўленне )
Ці адбылося тлумачэнне заяўлення?
Ці былі прадстаўлены факты, цытаты першакрыніц, статыстычныя дадзеныя ўплывовых арганізацый?
Ці прагучала высновa?

## 5. ДАДАТКОВАЕ ЗАДАННЕ

Трэніроўка ў выбудоўванні аргументаваных выказванняў па матэрыялах.
Трэнер прапануе для работы два артыкулы на выбар:

1. Заявление ВОЗ по вопросу о безопасности вакцины против COVID-19 компании AstraZeneca

1. ООН: коронавирус отбросил назад эмансипацию, вернув женщин на кухню

1. Прачытаць матэрыял (індывідуальна) — 10 хвілін.
2. Паспрабаваць знайсці ў матэрыяле ўсе элементы аргументаванага выказвання (ад сцвярджэння да заключэння) — 10 хвілін.
3. Аб'яднаўшыся ў групы, падзяліцца вынікамі самастойнай дзейнасці — 10 хвілін.
4. Выбудаваць (пісьмова) адзін найбольш поўны ланцужок аргументацыі.
5. Прадэманстраваць прадукт сваёй дзейнасці іншым групам.
6. Абмеркаванне атрыманых вынікаў (з пункту гледжання паўнаты, лагічнасці і несупярэчлівасці элементаў).

**Прыклад:**
**Заява:** "Некоторые страны Европейского союза временно приостановили использование вакцины против COVID-19 компании AstraZeneca".
**Тлумачэнне:** В связи с сообщениями о редких случаях тромбоза у лиц, получивших инъекции указанной вакцины. Однако вакцинация против COVID-19 не предотвращает развитие других заболеваний или смерть от других причин.
**Падтрымка:** ВОЗ находится в постоянном контакте с Европейским агентством по лекарственным средствам и органами регулирования по всему миру и ведет обмен наиболее актуальной информацией о безопасности вакцин против COVID-19. В настоящий момент Глобальный консультативный комитет по безопасности вакцин выполняет тщательный анализ последних данных, касающихся безопасности вакцины компании AstraZeneca. По завершении этого анализа ВОЗ незамедлительно представит его результаты общественности.
**Заключэнне:** На текущий момент ВОЗ считает, что преимущества использования вакцины компании AstraZeneca перевешивают существующие риски.
**Закончыце сказ:**
«Для таго, каб спраўдзіць інфармацыю пра COVID-19, неабходна…»
«Для таго, каб пераканаўча выказацца па праблеме…, варта…»

## ПАРАДЫ НАСТАЎНІКУ

- Практыкаванне развівае крытычнае мысленне, уменне ацэньваць і рабіць адказны выбар, можа выкарыстоўвацца як у дарослай аўдыторыі, так і ў рабоце з вучнямі сярэдняга і старэйшага ўзросту на ўроках гуманітарнага, прыродазнаўчага цыклу, падчас класнай, інфармацыйнай гадзіны.
  Занятак праводзіцца ў адпаведнасці з тэхналогіяй развіцця крытычнага мыслення (Reading and Writing for Critical Thinking).
  Аўтары Ч. Тэмпл, К. Мэрэдыт, Дж. Сціл.

## АЎТАР

- **Алена Радзевіч**

# Вакцыны супраць каранавіруса: як справы ў Беларусі і ў свеце

| #МЕДЫЯ | ЧАС | ПРАДМЕТ | КЛАС | ТЭМА | ПАДРЫХТОЎКА | ТУЛКІТ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Пошук і аналіз інфармацыі | 45 хвілін | Класная гадзіна | 8-11 | Вакцынацыя супраць каранавіруса | Праектар, тэлефоны з выхадам у інтэрнэт | |

**МЭТА**

Вучні даследуюць, як ідзе працэс вакцынацыі ў Беларусі, параўнаюць з іншымі краінамі, выкажуць меркаванні аб прычынах адрозненняў.



## 1. ЯКІЯ ВАКЦЫНЫ НАЙБОЛЬШ РАСПАЎСЮДЖАНЫЯ?

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на супярэчлівую інфармацыю ў медыя пра вакцыны ад каранавіруса, якую нават называюць “вайной вакцын” і прапануе правесці міні-даследванне пра вакцынацыю.
Вучні атрымліваюць для работы інфаграфіку пра распаўсюджванне вакцын у свеце і адказваюць на пытанні




**Якія вакцыны найбольш распаўсюджаны ў свеце?**
**У якіх краінах яны распрацаваныя?**
**Ці ёсць у беларусаў шанец атрымаць прышчэпку найбольш папулярнымі вакцынамі? Чаму вы так думаеце?**

## 2. ЯКІЯ ПРАГНОЗЫ ПА ВАКЦЫНАЦЫІ?

Настаўнік прапануе інфаграфіку “Прагназаваны графік вакцынацыі супраць COVID-19” і пытанні да яе.
Вучні аналізуюць інфаграфіку і адказваюць на пытанні да яе.

**Калі ў Беларусі будзе праведзена вакцынацыя згодна прагнозу?**
**Да якой групы краін адносіцца Беларусь па гэтаму прагнозу? Чаму так сталася?**




## 3. ЯК ПРАЦЭС ВАКЦЫНАЦЫІ ІДЗЕ Ў РОЗНЫХ КРАІНАХ?

Настаўнік прапануе праверыць інфармацыю па Беларусі, краінах-суседках і іншых краінах і выкарыстаць для гэтага глабальныя інфармацыйныя рэсурсы, дзе звесткі пастаянна збіраюцца і абнаўляюцца (напрыклад, сайт
“Our World in Data”). Медыя bbc.com прадставіла форму, у якой проста знайсці інфармацыю пра ўсе краіны свету, у тым ліку і пра Беларусь.




Настаўнік прапануе вучням выбраць некалькі краін, з якімі можна параўнаць вакцынацыю ў Беларусі. Вучні запаўняюць табліцу, у якой пазначаюць па выбраных краінах пачатак вакцынацыі, колькасць прышчэпленых, колькасць доз на 100 чалавек, тып вакцыны.

## 4. ВЫНІКОВАЕ АБМЕРКАВАННЕ І ДЫСКУСІЯ

Адбываецца прадстаўленне, параўнанне і абмеркаванне даных з табліц.
Вучні адказваюць на наступныя пытанні:

**Як вы думаеце, які з паказчыкаў у найбольшай ступені сведчыць пра поспех ці няўдачу вакцынацыі ў краінах?**
**Якія асаблівасці вы заўважылі ў выкарыстанні тыпаў вакцыны?**
**Чым яны тлумачацца?**
**Якую выснову можна зрабіць з параўнальнай табліцы?**
**Чым тлумачыцца такая розніца ў паказчыках вакцынацыі?**

## ПАРАДЫ НАСТАЎНІКУ

- Магчыма работа ў групах: кожная група выбірае ці атрымлівае ад настаўніка спіс краін, напрыклад, краіны-суседкі Беларусі, краіны, у якіх колькасць насельніцтва блізкая да Беларусі, постсавецкія краіны. Пасля абмеркавання вынікаў табліц мэтазгодна арганізаваць дыскусію.

## АЎТАР

- **Наталля Ільініч**

# Актуальнае аб каранавірусе: ствараем чэк-лісты

| #МЕДЫЯ | ЧАС | ПРАДМЕТ | КЛАС | ТЭМА | ПАДРЫХТОЎКА | ТУЛКІТ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Аналіз інфармацыі | 45 хвілін | Выхаваўчы занятак | 5-11 | Што мы ведаем аб каранавірусе? | Артыкулы аб каранавірусе | |

**МЭТА**

Навучэнцы прадэманструюць уменні працаваць з тэкстамі, навучацца вызначаць у тэкстах самае галоўнае і значнае, створаць чэк-лісты па праблеме

## 1. ПАГЛЫБЛЕННЕ Ў ПРАБЛЕМУ

Настаўнік прапануе вучням распавесці аб праблеме пад назвай «Каранавірус». Настаўнік цікавіцца ў навучэнцаў, адкуль яны бяруць інфармацыю, як вызначаюць, што яна праўдзівая і не супярэчлівая.

## 2. ПАСТАНОЎКА ТВОРЧАЙ ЗАДАЧЫ

Настаўнік прапануе вучням сістэматызаваць веды аб каранавірусе і на падставе аналізу медыя стварыць ЧЭК-ЛІСТЫ па тэмах:
«Сімптомы каранавіруса»,
«Прафілактыка каранавіруса» (у сям'і, у школе, на вуліцы, у грамадскіх месцах),
«Лячэнне каранавіруса» (лёгкая форма захворвання),
«Значныя факты аб каранавірусе»,
«Мае дзеянні пры эпідэміі каранавіруса» (у сям'і, у школе, на вуліцы).
Настаўнік дзеліць вучняў на творчыя групы па 4-5 чалавек.
Кожная група атрымлівае тэму (ці выбірае сама) і на працягу 15-20 хвілін стварае чэк-ліст.

## 3. СТВАРЭННЕ ЧЭК-ЛІСТОЎ

Праца з медыяінфармацыяй можа весціся па-рознаму:

- вучні самі вызначаюць, якімі крыніцамі карыстацца;
- вучням прапануецца інфармацыя ў выглядзе артыкулаў, з якіх яны павінны ўзяць патрэбную інфармацыю для стварэння чэк-лістоў.

Чэк-ліст — гэта спіс падказак, дзеянняў, парадаў. Сэнс чэк-ліста — стварэнне аптымальнага пераліку з'яў, прыкмет, дзеянняў і г.д.

Алгарытм працы над стварэннем чэк-ліста:

1. Прачытаць інфармацыю аб праблеме.
2. Вызначыць у тэксце пазіцыі, якія адпавядаюць абранай тэме.
3. Сфармуляваць вызначаныя пазіцыі коратка, лаканічна, з захаваннем сэнсу ў выглядзе пунктаў.
4. Ранжыраваць сфармуляваныя пункты.
5. Запісаць пункты ў выглядзе чэк-ліста (звычайна ў чэк-лісце ёсць не толькі пункты ў выглядзе правіл, дзеянняў, законаў, а і месца для таго, каб можна было пазначыць нейкім знакам датычнасць да гэтага пункта,

## 4. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ ТВОРЧАЙ РАБОТЫ

Кожная група прэзентуе свой чэк-ліст, адказвае на пытанні вучняў класа.

## 5. РЭФЛЕКСІЯ

Настаўнік запытваецца ў вучняў, для якой мэтавай аўдыторыі падыходзіць іх чэк-ліст, ці была карыснай праца над стварэннем чэк-лістоў; з якімі праблемамі яны сутыкнуліся ў працэсе аналізу інфармацыі; якія парады можна прапанаваць аднакласнікам у рабоце з інфармацыяй.

### ПАРАДЫ НАСТАЎНІКУ

- Вучням можна даць дамашняе заданне знайсці інфармацыю па тэме. Вучні прыносяць з сабой артыкулы, з якімі працуюць. У гэтым выпадку настаўніку абавязкова трэба разам з вучнямі прааналізаваць крыніцы інфармацыі, якімі яны будуць карыстацца.

**АЎТАР** Міхась Кудзейка

# Я мяркую, гэта факт!

| #МЕДЫЯ | ЧАС | ПРАДМЕТ | КЛАС | ТЭМА | ПАДРЫХТОЎКА | ТУЛКІТ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Факты і меркаванні | 5 хвілін | Беларуская мова, руская мова, літаратура | 7 | Сачыненне-апісанне горада | Дома напісаць 3-5 сказаў пра Полацк | |

**МЭТА**

Удзельнікі змогуць адрозніць факты ад меркаванняў у вучэбным тэксце і стварыць уласныя.



## 1. АКТУАЛІЗАЦЫЯ ВЕДАЎ ВУЧНЯЎ (ПРАВЕРКА ДАМАШНЯГА ЗАДАННЯ)

На ўрок вучням задаецца спецыяльнае дамашняе заданне: напісаць 3-5 сказаў на вызначаную тэму. Пры абмеркаванні настаўнік просіць вызначыць, факты ці меркаванні запісалі вучні. Нагадвае, што фактуальнае выказванне — выказванне, адносна якога існуюць агульнапрынятыя спосабы вызначэння яго праўдзівасці або фальшывасці. Меркавальнае выказванне (ці проста меркаванне) — сцверджанне, якое хтосьці лічыць праўдзівым або праўдападобным, але для якога не існуюць агульнапрынятыя спосабы вызначэння праўдзівасці або фальшывасці. Настаўнік тлумачыць пры неабходнасці, што «Полацк упершыню згадваецца ў летапісах у 862 годзе» — гэта факт, а «Полацк прыгожы горад» — меркаванне.

## 2. ЗАМАЦАВАННЕ РАЗУМЕННЯ АДРОЗНЕННЯЎ ФАКТАЎ АД МЕРКАВАННЯЎ

Настаўнік прапануе вучням праверыць разуменне адрозненняў фактаў ад меркаванняў па падрыхтаваных выказваннях:

**Першым полацкім князем быў Рагвалод. (Ф)**
**Рагнеда была вельмі прыгожая. (М)**
**Еўфрасіння Полацкая была ўнучкай Усяслава Чарадзея. (Ф)**
**Сафійскі сабор лепей выглядае, калі глядзець на яго з другога берага Дзвіны. (М)**
**У студзені 1964 года касцёл Святога Стэфана і частка Полацкага езуіцкага калегіума былі ўзарваны савецкай уладай. (Ф)**
**Добра, што ў Багаяўленскім саборы болей няма карціннай галерэі. (М)**

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на тое, што пры стварэнні навуковага апісання меркаванні дапускаюцца толькі ў выглядзе навуковых гіпотэз, а пры стварэнні мастацкага тэксту ўласнае меркаванне ці не найбольш каштоўны складнік.

## 3. ПАДРЫХТОЎКА ДА САЧЫНЕННЯ-АПІСАННЯ

Вучні пры абмеркаванні плана сачынення вызначаюць, што ў іх сачыненні ў розных частках могуць быць скарыстаны і факты, і меркаванні:

1. Уводзіны. Агульнае ўражанне ад прадмета (2-4 сказы, М).
2. Асноўная частка. Пералік асобных прымет (5-10 сказаў). Асноўная частка павінна ўтрымліваць 3 абзацы: у першым падаюцца факты з гісторыі Полацка (Ф), другі апісвае адзін з гарадскіх помнікаў (Ф і М), трэці расказвае пра вуліцу, на якой ты жывеш (Ф і М).
3. Агульная ацэнка (2-3 сказы, М).

У крытэрыі ацэнкі сачынення варта ўключыць пункт «Не забывай, што ў сачыненні неабходна апісаць тваё асабістае бачанне роднага горада. Ужывай пры выказванні меркаванняў такія канструкцыі, як »мне здаецца», «я мяркую», «на маю думку».

### ПАРАДЫ НАСТАЎНІКУ

- Практыкаванне можна праводзіць перад любым сачыненнем па мове, перад вывучэннем біяграфіі пісьменніка на літаратуры.

### АЎТАР

- Лера Сом

# Прыгоды Чыпаліны ці загадка Джані Радары

| #МЕДЫЯ | ЧАС | ПРАДМЕТ | КЛАС | ТЭМА | ПАДРЫХТОЎКА | ТУЛКІТ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Пошук інфармацыі, дэкадаванне медыятэкстаў, маніпуляцыя, свабода слова | 45 хвілін | Класная гадзіна, выхаваўчы занятак | 9-11, дарослыя | Развіццё крытычнага мыслення | Праектар для дэманстрацыі відэа | |

**МЭТА**

Удзельнікі развіваюць уменне аналізаваць, ацэньваць і дэкадаваць інфармацыю на прыкладзе казкі «Прыгоды Чыпаліны».

## 1. УВОДЗІНЫ Ў ТЭМУ

Спачатку настаўнік прапануе здагадацца пра тэму занятку (паказвае карцінкі з выявамі цыбулі, памідора, лімона, гарбуза і вішні) і прапануе адказаць на пытанне: «Што аб'ядноўвае гэтыя прадметы?»
Калі ў вучняў не будзе правільнага адказу, настаўнік паказвае фота Джані Радары.
У крайнім выпадку настаўнік паказвае кароткі ўрывак з мультфільма «Чыпаліна»

(2.06 - 2.09)
Ключавое пытанне: «Чаму героямі казкі з'яўляюцца не людзі, а садавіна і гародніна? І як гэта можа быць звязана з жыццём і творчасцю Джані Радары?»

## 2. РАБОТА Ў ГРУПАХ

Настаўнік дзеліць клас на групы, тлумачыць, што на работу ў групах будзе 10 хвілін, а для пошуку адказаў можна карыстацца любымі крыніцамі інфармацыі.
Вучні абмяркоўваюць і даюць адказы на пытанні:

**Група 1.**
Што такое казка? Чым казка адрозніваецца ад рэчаіснасці?
Ці можа казкаператварыцца ў рэчаіснасць? А наадварот?
Чаму Джані Радары спыніў свой выбар на казачным жанры, а не напісаў раман?
Ці можна яго казкі назваць чароўнымі? Чаму?

**Група 2.**
Што вы ведаеце пра Беніта Мусаліні?
Апішыце ў пяці пунктах, што адбывалася ў Італіі ў часы яго праўлення.

**Група 3**
Ці ёсць сувязь паміж творамі і фактамі з біяграфіі Джані Радары?
Якая? І як вы лічыце, чаму?
(Улічыце наступныя факты яго біяграфіі: вучоба ў каталіцкай семінарыі, праца гувернёрам у сям'і нямецкіх яўрэяў, бежанцаў з нацысцкай Германіі, праца настаўнікам пачатковых класаў, удзел у нацысцкай фашысцкай партыі пад кіраўніцтвам Мусаліні, знаходжанне брата ў фашысцкім канцэнтрацыйным лагеры.)

Для поўнага разумення праблематыкі настаўнік прапануе вучням папрацаваць з рознымі крыніцамі, дзе можна пазнаёміцца з біяграфіяй Джані Радары і нагадвае аб неабходнасці звярнуць увагу на гістарычныя падзеі, якія адбываліся ў гады жыцця пісьменніка.

**Прыкладныя спасылкі:**

## 3. АБМЕРКАВАННЕ

Настаўнік прапануе звярнуцца да творчасці і біяграфіі пісьменніка і адказаць на пытанні, над якімі працавалі групы.

**Дадатковае пытанне:**

- Прывядзіце прыклады з творчасці іншых пісьменнікаў. Як гістарычныя падзеі, у час якіх яны жылі, паўплывалі на творчасць?
Чаму так адбываецца?

## 4. РАБОТА З ВІДЭА

Настаўнік прапануе вучням паразважаць над некаторымі эпізодамі мультфільма "Чиполлино" (Союзмультфильм, 1961 г.) **0.55 – 2.15**

Эпізод размовы Чыпаліны з дзядзькам Вінаградам. У чым яго абвінавачваюць? Што адбылося на самой справе? Як гэта тлумачыць Чыпаліна? Як рэагуе Вінаград? Чаму? **3.28 – 4.00**

Бацька Чыпаліна трапляе за краты. Чаму? Хто распаўсюджвае фэйкавыя навіны? Навошта? Як на гэта рэагуе Чыпаліна? **4.59 – 5.34**

Размова Чыпаліны з бацькам у турме. Што думаў Чыпаліна пра турму? Што яму на гэта адказаў бацька? **7.22 – 8.35**

За што раззлаваўся сеньёр Памідор на Гарбуза? Чаму Чыпаліна паказаў яму люстэрка? Чаму заплакаў Памідор? Што ён паабяцаў? **12.41 – 13.02**

Якія маніпулятыўныя прыёмы прымяніў сеньёр Памідор для ўздзеяння на графіню Вішню? **14.10 – 14.47 і 18.33 – 18.53**

Чаму Вішанка сказаў, што ён прызвычаіўся да непрыемнасцей? **15.07 – 15.50**

Аб чым сведчыць эпізод з вобшукам у турме? **16.30 – 17.10**

Размова Чыпаліны, Радыскі з Вішанкам. Чаму Вішанка вырашыў, што Чыпаліна – добры хлопчык? Якую выснову можна з гэтага зрабіць? **32.23 – 33.10**

Сцэна выступлення прынца Лімона на плошчы перад жыхарамі. Чаму, па словах прынца Лімона, даходы дзяржавы паменшыліся? Як ён прапануе вырашыць гэту праблему? **34.30 – 36.42**

За што прынц Лімон загадаў знішчыць дом Гарбуза? Як на гэта адрэагаваў натоўп? Што зрабіў Гарбуз? Што сказаў Чыпаліна? Чаму загінуў сеньёр Памідор і яго ахоўнікі?

## 5. АБМЕРКАВАННЕ КЛЮЧАВОГА ПЫТАННЯ Ў ГРУПАХ

Вучні ў групах даюць адказ на пытанні «Чаму героямі казкі з'яўляюцца не людзі, а садавіна і гародніна? Ці звязана гэта з жыццём Джані Радары?»

Пытанні для падсумавання:

— Чаму аўтар выкарыстаў  прыём пераносу чалавечых якасцей на садавіну і гародніну?
— Якую афарбоўку мае выраз «Як у казцы...» у сучасным жыцці?
— Пры якіх гістарычных падзеях гэты мультфільм будзе актуальным і чаму?

### ПАРАДЫ НАСТАЎНІКУ

- Перад класнай гадзінай можна даць заданне прагледзець мультыплікацыйны фільм дома.

### АЎТАР

- **Наталля Катчанка**

# Грошы як медыятэкст?

| #МЕДЫЯ | ЧАС | ПРАДМЕТ | КЛАС | ТЭМА | ПАДРЫХТОЎКА |
| --- | --- | --- | --- | --- | --- |
| Пошук інфармацыі, Дэкадаванне медыя-тэкстаў, Мова медыя | 15 хвілін | Беларуская мова | 9 | Складана-злучаны і складана-залежны сказ | Выявы беларускіх банкнот і манет |

**ТУЛКІТ**

**МЭТА**

Практыкаванне дапамагае вучням зразумець, што з медыятэкстамі яны сутыкаюцца кожны дзень, нават выявы на грашах нясуць пэўны пасыл, і дэкадаванне іх з'яўляецца неабходнай часткай нашага жыцця.



## 1. АНАЛІЗ ПРЫКАЗАК НА ТЭМУ «ГРОШЫ»

Практыкаванне прапануецца вучням  бліжэй да канца вышэйназванага ўрока.
Непасрэдна перад практыкаваннем можна правесці аналіз прыказак па прапанаваных пытаннях:
**— Вызначыце віды сказаў, пабудуйце схемы.**
**— Якой тэмай аб’яднаны прапанаваныя прыказкі?**
**— Як вы разумееце іх сэнс?**
Якія грошы, такі і тавар.
Дарагое паносіцца ўдвое.
Што дорага, то міла, а што танна, то гніла.
За морам цялушка палушка, ды рубель перавоз.
У працэсе работы навучэнцы прыходзяць да высновы, што прыказкі падабраныя на тэму «Грошы».

## 2. ДЭКАДАВАННЕ МЕДЫЯТЭКСТАЎ – БАНКНОТЫ НБРБ

Пасля вызначэння тэмы «Грошы» дэманструюцца выявы беларускіх грошаў (банкнот і манет).

Выявы  на сайце нацыянальнага банка РБ:
Настаўнік прапануе адказаць на пытанні:
— Што адлюстравана на банкнотах і манетах?
— Чым абумоўлены такі выбар?
— Чаму менавіта такім чынам былі падзелены наміналы банкнот: 5 рублёў — Брэсцкая вобласць, 10 — Віцебская і г.д?
(на гэтым этапе, калі ўзнікне патрэба,  можна выкарыстаць пошук у інтэрнэце неабходнай інфармацыі).
— Які меседж нясуць нам выявы вядомых архітэктурных помнікаў?
— Якія выявы размясцілі б на грошах вы?

Адказы фармулююцца ў выглядзе складаназлучаных ці складаназалежных сказаў і запісваюцца. Пасля адбываецца праверка і абмеркаванне ў парах.

## 3. ВЫСНОВА

Пры  выніковым падсумаванні настаўнік прыводзіць вучняў да думкі, што выявы на грошах — частка іміджу краіны і павінны быць грунтоўна прадуманы

### ПАРАДЫ НАСТАЎНІКУ

- Практыкаванне можна правесці без падводкі тэмы праз прыказкі.

### АЎТАР

- Таццяна Зямлянік

# Запытайся на роднай мове ў Google

| #МЕДЫЯ | ЧАС | ПРАДМЕТ | КЛАС | ТЭМА | ПАДРЫХТОЎКА | ТУЛКІТ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Пошук інфармацыі<br>Дэкадаванне медыятэкстаў<br>Мова медыя | 15 хвілін | Інфармацыйная гадзіна | 4-5 | Дзень роднай мовы | Выхад у інтэрнэт, экран і праектар для дэманстрацыі | |

**МЭТА**

Малодшыя школьнікі параўнаюць розныя вынікі аднолькавага запыту ў Google на трох розных мовах (беларускай, рускай, англійскай ці іншай замежнай) і зразумеюць, што інтэрнэт для карыстальніка кожнай мовы «розны».

## 1. РАБОТА З ВЫНІКАМІ ПОШУКУ ПА КАРЦІНКАХ

Настаўнік з вучнямі знаходзяць выявы, якія паказвае пошукавік Google пры запытах «Дзень роднай мовы» на беларускай, рускай і англійскай мовах. Звяртаецца ўвага на тое, што пры кожным запыце ў сеціве прапануецца розная інфармацыя.




Вучні абмяркоўваюць і прыходзяць да высновы, што мова запыту мае значэнне, а інтэрнэт для карыстальніка кожнай мовы «розны».

## 2. АБМЕРКАВАННЕ БЕЛАРУСКІХ ПЛАКАТАЎ

Настаўнік прапануе абмеркаваць беларускія плакаты да гэтага свята, звяртае ўвагу на іх колеравую гаму.

**Пытанні для абмеркавання ў групах:**

— Якія два колеры найчасцей выкарыстоўваюцца ў плакатах і паштоўках да Дня роднай мовы? (Белы, чырвоны).
— Як вы лічыце, чаму менавіта гэтыя колеры галоўныя на беларускіх плакатах? (Гэта нацыянальныя колеры).
— Ці можам мы вызначыць нацыянальныя колеры ў рускіх і англамоўных плакатах? (Не, там выкарыстаны вельмі розныя колеры).
— Чаму так? (Англійскую і рускую мовы ў гэтых плакатах выкарыстоўваюць людзі розных нацыянальнасцей).
— Якія агульнавядомыя сімвалы Беларусі мы бачым на гэтых выявах? (Васількі).
— Якую літару і чаму мы можам знайсці на многіх выявах? (Ў, яна ўнікальная, наша, беларуская).
— Якія яшчэ адметныя выявы, якія паказваюць, што плакат (паштоўка) прысвечаны менавіта беларускай мове, мы бачым? (Нацыянальны арнамент).

## 3. СТВАРЭННЕ СВАЁЙ ПАШТОЎКІ

Работа ў групах. Вучні ствараюць сваю паштоўку да Дня роднай мовы. Для яе аздаблення яны павінны выкарыстаць тры колеры і ўжыць адзін з сімвалаў Беларусі.

### ПАРАДЫ НАСТАЎНІКУ

- Практыкаванне можна выканаць на інфармацыйнай гадзіне перад Днём роднай мовы ці неўзабаве пасля яго. Пры адсутнасці доступу да інтэрнэта неабходныя выявы можна падрыхтаваць загадзя.

### АЎТАР

- Лера Сом

# Страчаныя аблічы

| #МЕДЫЯ | ЧАС | ПРАДМЕТ | КЛАС | ТЭМА | ПАДРЫХТОЎКА | ТУЛКІТ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Маніпуляцыя, дэкадаванне медыя-тэкстаў, свабода слова, прапаганда | 20 хвілін | Гісторыя Беларусі, беларуская літаратура | 9-11 | БССР у 20-30 гг. (развіццё літаратуры, грамадска-палітычнае жыццё і інш.) | Раздрукоўкі фотаздымкаў беларускіх літаратараў, раздатка памяткі для аналізу фота | |

**МЭТА**

Удзельнікі зразумеюць, што фота ў прэсе часта з'яўляюцца сродкамі для маніпуляцыі грамадскай свядомасцю і інструментам прапаганды, і здолеюць выявіць фотаманіпуляцыі (рэтуш ці мантаж).

## 1. РАБОТА З ФОТАКЕЙСАМ

Настаўнік прапануе папрацаваць у групах (па 4-5 чалавек) з аднолькавым наборам з трох фатаграфій з памяткай для аналізу фота (гл. раздатку). Вучням трэба параўнаць тры фатаграфіі, якія былі апублікаваны ў розны час, і сказаць, што ў іх агульнага і чым яны адрозніваюцца.







Для падвядзення вынікаў групавой работы настаўнік прапануе скарыстацца формулай: «Апроч таго, ШТО паказана на здымку, трэба ўбачыць, ЯК гэта паказана, ЧАМУ менавіта так і што НЕ паказана».

Плануецца, што вучні апішуць людзей на фота як прадстаўнікоў інтэлігенцыі (хутчэй за ўсё пазнаюць Янку Купалу і таму вырашаць, што гэта пісьменнікі). Вучні адзначаць, што фота пастановачнае (людзі спецыяльна пазіруюць). Пры апісанні таго, як згрупаваны людзі на здымках, якія ў іх позы, касцюмы, вучні заўважаць, што гэта адна і тая ж фатаграфія, з якой выдалены выявы некалькі асоб. І выкажуць меркаванне, што першапачатковае фота — з дзевяццю асобамі.

## 2. РАБОТА З ІНФАРМАЦЫЯЙ ДА ФОТА

Настаўнік раздае групам інфармацыю пра фота з дзевяццю пісьменнікамі і прапануе ўстанавіць асоб, якія былі выдалены.
Фота — арыгінал здымка 1926 года «Беларускія пісьменнікі на сустрэчы з Я. Райнісам». У ніжнім шэрагу злева направа: Змітрок Бядуля, Ян Райніс, Янка Купала, Кандрат Крапіва. У верхнім шэрагу злева направа: Язэп Пушча, Адам Бабарэка, Уладзімір Дубоўка, Пятро Глебка, Кузьма Чорны.
Плануецца, што вучні пасля параўнання з арыгіналам іншых здымкаў вызначаць, што на другім няма Адама Бабарэкі, а на трэцім да Бабарэкі дадаліся Язэп Пушча і Уладзімір Дубоўка.
Настаўнік паведамляе, што Адам Бабарэка загінуў ў лагеры ў 1938 годзе, а Уладзімір Дубоўка і Язэп Пушча правялі ў ссылках некалькі дзесяцігоддзяў і дажылі да сваёй рэабілітацыі ў 1957 годзе (калі дазваляе час, вучні самі могуць адшукаць у інтэрнэце інфармацыю пра лёсы зніклых з фота асобаў).

## 3. АБМЕРКАВАННЕ ВЫНІКАЎ

Падчас абмеркавання праблематыкі рэпрэсій (у залежнасці ад тэмы ўрока і вучэбнага прадмета) настаўнік звяртаецца да пытанняў: «Калі і чаму фота перастае быць праўдай?», «Якія сродкі для гэтага выкарыстоўваліся раней, а якія цяпер?»

### ПАРАДЫ НАСТАЎНІКУ

- Для паспяховага правядзення гэтага практыкавання педагогу неабходна адабраць матэрыялы, якія маюць высокую значнасць для разумення гістарычнай эпохі і добры патэнцыял для работы з фотаманіпуляцыямі. Выдатным фотакейсам могуць стаць матэрыялы са зменамі аднаго фота, якое зазнала рэтуш і мантаж, ці было апрацавана спецыяльнымі камп'ютарнымі праграмамі ці вэб-сэрвісамі.
  На ўроках па айчыннай гісторыі і беларускай літаратуры рэкамендуецца звярнуць увагу на матэрыялы выставы «Страчаныя аблічы» ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы і публікацыі пра гэты мемарыяльны праект, прысвечаны трагічным падзеям айчыннай гісторыі — палітычным рэпрэсіям 20–50-х гадоў XX стагоддзя.

**Карысныя спасылкі:**
Инанец С. Остались шестеро из девяти.
Как репрессированных писателей вычеркивали с групповых фотографий

Чарнова А. Delete або чароўная кнопка, якая змяняе рэальнасць:

### АЎТАР

- **Алена Палейка**

# Як правесці інфармацыйную гадзіну?

| #МЕДЫЯ | ЧАС | ПРАДМЕТ | КЛАС | ТЭМА | ПАДРЫХТОЎКА | ТУЛКІТ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Навінавая граматнасць, аналіз інфармацыі | 20 хвілін | Інфармацыйная гадзіна | 5-11 | Любая | Раздаткі | |

**МЭТА**

Вучні атрымаюць інфармацыю пра актуальныя падзеі ў свеце і краіне, а таксама набудуць навыкі аналізу навін і крыніц інфармацыі.

## 1. ВЫБАР ЗМЕСТУ

Настаўнік выбірае сам або даручае вучням падабраць актуальныя навіны, з якімі варта пазнаёміць вучняў падчас інфармацыйнай гадзіны.

## 2. ВЫБАР МЕДЫЯ-ІНФАРМАЦЫЙНЫХ НАВЫКАЎ

Настаўнік выбірае са спісу медыя-інфармацыйных кампетэнцый адзін пункт, над якім вучні будуць працаваць падчас інфармацыйнай гадзіны.

| Ведаць: | Умець: | Мець каштоўнасныя ўстаноўкі: |
|---|---|---|
| • якую ролю адыгрываюць СМІ, як яны ўплываюць на асобу і грамадства;<br>• якія існуюць жанры журналістыкі, іх прызначэнне і адрозненні;<br>• што надзейнай інфармацыю робяць магчымасць праверкі фактаў, паказанні сведкаў, спасылкі на крыніцы;<br>• чаму ананімныя крыніцы – не надзейныя і спасылацца на іх не варта;<br>• якія спосабы ўплыву выкарыстоўваюць СМІ, як з дапамогай мантажу відэа, абрэзкі і апрацоўкі фота і гуку можна паўплываць на меседж рэпартажу;<br>• чаму важна, каб факты і асобы гаварылі самі за сябе. | • адбіраць рэлевантныя навінавыя каналы і навінавыя матэрыялы сярод інфармацыйнага патоку;<br>• адрозніваць факты ад меркаванняў, журналістаў ад каментатараў і тых, хто адстойвае пэўную пазіцыю;<br>• дэкадаваць (аналізаваць) матэрыялы СМІ, сацыяльных медыя;<br>• распазнаваць фэйк, маніпуляцыю, схаваную рэкламу і прапаганду;<br>• інтэрактыўна ўзаемадзейнічаць са СМІ, быць стваральнікам інфармацыйнай прасторы. | •крытычнае і рэфлексіўнае стаўленне да даступнай інфармацыі;<br>•адказнае і этычнае выкарыстанне інтэрактыўных сродкаў інфармацыі, павага да аўтарскіх правоў;<br>•павага да асноўных правоў і свабод асобы;<br>• захаванне сваёй нацыянальна-моўнай і цывілізацыйнай ідэнтычнасці. |

## 3. РАЗДРУКОЎКА РАЗДАТКАЎ

Настаўнік падбірае і пры неабходнасці раздрукоўвае адну з памятак, размешчаных у канцы гэтай кнігі, якая будзе найлепш спрыяць набыццю абранага навыку.

Спіс памятак (гл. раздзел «Дадаткі»):
**Ключавыя пытанні для аналізу медыятэкстаў (навіны, артыкула, фота, плаката, рэкламы, тэлеперадачы, роліка, фільма і т.п.)**
**Правяраем надзейнасць і дакладнасць інфармацыі**
**На што неабходна звярнуць увагу пры чытанні навін (як распазнаць фэйкі)**
**Як аддзяліць факты ад меркаванняў у медыя**
**Пытанні для аналізу прыёмаў у рэкламе**
**Правяраем наяўнасць стэрэатыпаў у рэкламе**
**Як аналізаваць рэкламны ролік?**
**Памятка для аналізу фатаграфіі**
**Памятка для работы з постарам фільма**
**Пытанні для аналізу медыяпрофілю персоны**
**Памятка для работы з фатаграфіяй помніка і мемарыяла**
**Аналіз выпуску навін (інструкцыя)**
**Форма ацэньвання інтэрнэт-рэсурсаў**
**Тэхнікі маніпуляцый**

## 4. АКТУАЛІЗАЦЫЯ ІНФАРМАЦЫІ І МАТЫВАЦЫЯ ВУЧНЯЎ НА АКТЫЎНУЮ СУМЕСНУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ

Вучні сядзяць у коле і па чарзе дзеляцца навінамі, адзначаюць крыніцу інфармацыі. Для малодшых школьнікаў можна падрыхтаваць цацачны мікрафон, які яны будуць перадаваць адзін аднаму. Для старэйшых школьнікаў можна выбраць мадэратара, які будзе даваць слова вучням.
Настаўнік акцэнтуе ўвагу на крыніцы інфармацыі, асаблівасці яе прадстаўлення ў розных медыя.

## 5. АСЭНСАВАННЕ ІНФАРМАЦЫІ І РАЗВІЦЦЁ ПЭЎНЫХ МЕДЫЯКАМПЕТЭНЦЫЙ

Вучні знаёмяцца з навінай ці актуальнай інфармацыяй, а потым працуюць індывідуальна, у парах ці групах з гэтым жа матэрыялам з дапамогай памяткі.
Напрыклад, калі настаўнік паставіў мэту стварыць умовы, каб дзеці навучыліся адбіраць надзейныя крыніцы інфармацыі, ён дае памятку правіл № 2 ці №13, каб вучні праверылі надзейнасць той крыніцы, з якой яны атрымалі інфармацыю. Потым просіць, каб вучні падабралі яшчэ некалькі альтэрнатыўных крыніц з гэтай жа навінай, параўналі, ці аднолькава яны падаюць інфармацыю.
Калі ж мэта была — навучыць вучняў знаходзіць схаваную рэкламу ў медыя (product placement), то памятка «Аналіз прыёмаў у рэкламе» будзе найлепшай.

## 6. АСЭНСАВАННЕ, РЭФЛЕКСІЯ

Групы (пары) па чарзе агучваюць свае высновы па кожным пытанні памяткі, астатнія — спрачаюцца, задаюць пытанні ці дадаюць свае высновы.

### ПАРАДЫ НАСТАЎНІКУ

- Памятаем, што галоўная мэта інфармацыйнай гадзіны — не інфармаваць, а фарміраваць навінавую граматнасць!

### АЎТАРЫ

- **Тамара Мацкевіч, Алена Радзевіч, Алена Палейка**

# «Чытаем» схему метро

| #МЕДЫЯ | ЧАС | ПРАДМЕТ | КЛАС | ТЭМА | ПАДРЫХТОЎКА | ТУЛКІТ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Дэкадаванне, медыятэксту, ацэнка інфармацыі | 20 хвілін | Інфармацыйная гадзіна | 9-11 | Мінскае метро | Экран і праектар для дэманстрацыі схемы метро | |

**МЭТА**

**Удзельнікі:**

— зразумеюць, што медыятэксты — гэта не толькі тэленавіны, газетныя артыкулы, відэаролікі, але і схемы, абвесткі, постары, карты і інш.

— прааналізуюць схему метро (на прыкладзе мінскага метрапалітэна)

— вылучаць і сфармулююць прынцыпы, кіруючыся якімі станцыі атрымлівалі свае назвы

— выкажуць меркаванне, якім чынам схема метро з'яўляецца візітоўкай горада (што яна распавядае пра горад, што паказвае?)

## 1. МАТЫВАЦЫЯ ВУЧНЯЎ І ПАДЗЕЛ НА ГРУПЫ (1-2 ХВІЛІНЫ)

Настаўнік гаворыць, што метро з'яўляецца не толькі хуткім, зручным і папулярным спосабам перамяшчэння ў вялікім горадзе, але і сапраўдным візітоўкай мегаполіса. Настаўнік дэманструе схему мінскага метрапалітэна і прапануе ў групах (па 5-6 чалавек) папрацаваць з ёй, каб даць адказ на ключавое пытанне «Чаму схему метро называюць візітоўкай горада?»




## 2. РАБОТА З НАЗВАМІ СТАНЦЫЙ МЕТРО Ў ГРУПАХ (8 ХВІЛІН.)

Прапануе вучням згрупаваць назвы станцый метрапалітэна ў 3-4 блокі (групы самі вылучаюць катэгорыі і напаўняюць іх). Напрыклад, станцыі, у назве якіх згадваюцца нейкія асобы (Купалаўская, Пушкінская, плошча Якуба Коласа, плошча Леніна, плошча Францішка Багушэвіча, Фрунзенская), назва гістарычнай падзеі (плошча Перамогі, Партызанская, плошча Незалежнасці, Першамайская, Кастрычніцкая – з 33 станцый мінскага метро 13 маюць станцыі-цёзкі ў іншых гарадах СНД), назва сучаснага гарадскога аб'екта на гэтым месцы (Трактарны завод, Аўтазаводская, Інстытут культуры, парк Чалюскінцаў, Вакзальная, Акадэмія навук), гістарычная аўтэнтычная назва вуліцы ці вёскі (Няміга, Уручча, Кунцаўшчына, Грушаўка, Пятроўшчына, Кавальская слабада, Каменная горка), старана свету, кірунак (Усход, Магілёўская, Маскоўская, Барысаўскі тракт), агульная назва (Маладзёжная, Спартыўная).

## 3. АБМЕРКАВАННЕ ВЫНІКАЎ ГРУПАВОЙ РАБОТЫ (8 ХВІЛІН)

Падчас агучвання і абмеркавання вынікаў вучні вылучаць назвы, звязаныя з савецкім перыядам гісторыі (якія былі ў кожным савецкім горадзе) і з аўтэнтычнымі і гістарычнымі беларускімі назвамі (перадаюць унікальнасць, адметнасць). Вучні знаёмяцца з датамі ўвядзення ліній метро (1984,1995, 2020 гг.) і адзначаюць, як мянялася тэндэнцыя — якіх назваў станавілася больш, а якіх менш. Якіх назваў не хапае? Якія лепш замяніць? Ці трэба ўвогуле гэта рабіць?

## 4. СТВАРЭННЕ АЛЬТЭРНАТЫВЫ

Арыентуючыся на вынікі абмеркавання, настаўнік можа прапанаваць вучням стварыць альтэрнатыўныя назвы станцый (і адпаведна ліній) ці пазнаёміць з існуючымі схемамі з альтэрнатыўнымі назвамі.

Вяртанне да ключавога пытання «Чаму метро называюць візітоўкай горада?»

## ПАРАДЫ НАСТАЎНІКУ

- Рэкамендуецца выкарыстоўваць афіцыйны сайт Мінскага метрапалітэна:

Падчас абмеркавання можна зрабіць акцэнт на мову схемы метро (назвы на беларускай і іх транслітэрацыя беларускай лацінкай). Мэтазгодна для падрыхтоўкі да занятку выкарыстаць цікавыя факты пра метро ў свеце (першая падземка з’явілася ў Лондане ў 1863 годзе, а якія падзеі ў гэты час адбываліся ў Беларусі, самае глыбокае метро, самае вялікае і іншыя).

## АЎТАР

- **Алена Палейка**
(ідэя работы з гарадской тапанімікай як з медыятэкстам — **Дар’я Касякова**).

# Навошта ствараць стыкерпак?

| #МЕДЫЯ | ЧАС | ПРАДМЕТ | КЛАС | ТЭМА | ПАДРЫХТОЎКА | ТУЛКІТ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Мова медыя, праект | 20 хвілін | Выхаваўчы занятак | Дарослыя, падлеткі | Медыя-адукацыя | Аркушы паперы, фламастары | |

**МЭТА**

З дапамогай практыкавання дзеці і дарослыя пазнаёмяцца з тэхналогіяй стварэння стыкерпакаў, навучацца кадаваць і дэкадаваць інфармацыю, заключаную ў малюнках-стыкерпаках, што выкарыстоўваюцца ў месенджарах

## 1. АКТУАЛІЗАЦЫЯ ВЕДАЎ ВУЧНЯЎ ПА ТЭМЕ

Настаўнік пытаецца, ці знаёмы хто-небудзь са словам «стыкерпак». Пры неабходнасці распавядае, што стыкерпак — гэта набор стыкераў (наклеек), аб’яднаных адной тэмай. Стыкерпакі мы звычайна выкарыстоўваем у месенджарах. Прапануе загрузіць які-небудзь месенджар на смартфоне і прагледзець стандартныя стыкерпакі, якія там ёсць.

## 2. ЗАДАННЕ

Настаўнік прапануе, выкарыстоўваючы паперу, фламастары, алоўкі, стварыць набор стыкераў на прапанаваную актуальную тэму.
Напрыклад, для дзяцей — «Covid-19», «Дабрыня», «Справядлівасць», «Дэмакратыя», «Шчасце» і інш.
Для дарослых — «Я і свабода», «Гуманізм у адукацыі», «Ключавыя кампетэнцыі», «Soft Skills», «Сямейныя каштоўнасці» і інш.

## 3. РАБОТА НАД МІНІ-ПРАЕКТАМ

1. Настаўнік аб’ядноўвае ўдзельнікаў у групы па 5-6 чалавек, прапануе заданні для груп:
— вызначыць ключавыя словы (паняцці, падзеі, якасці) па змесце і зашыфраваць іх сімваламі (стыкерамі);
— выявы размясціць па адной на асноўных аркушах.
Дадаць падыходзячыя эмацыйныя надпісы (матывуючыя, жартаўлівыя ці прыкольныя).
2. Настаўнік арганізуе прэзентацыю стыкераў:
— у выглядзе загадкі для іншых груп;
— як абарону вынікаў сваёй творчай дзейнасці.

## 4. РЭФЛЕКСІЯ

Настаўнік арганізуе сумесны аналіз творчых работ і рэфлексію. Пытанні для абмеркавання: інфарматыўнасць, эфектыўнасць, магчымасць выкарыстання (дзе, як, калі) і г.д. Звяртае ўвагу на мову стыкерпакаў, сродкі выразнасці.

### ПАРАДЫ НАСТАЎНІКУ

- Варыянт правядзення. Удзельнікам практыкавання можна распавесці, што існуюць камп’ютарныя праграмы па стварэнні аўтарскіх стыкерпакаў для месенджараў. Калі ёсць цікавасць і магчымасці, то можна працягнуць працу па стварэнні электронных стыкерпакаў і груп па іх абмену ў месенджары.

### АЎТАР

- **Вікторыя Гракава**

# «А што, так можна?» Агучванне мультфільма.

| #МЕДЫЯ | ЧАС | ПРАДМЕТ | КЛАС | ТЭМА | ПАДРЫХТОЎКА | ТУЛКІТ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Дэкадаванне медыятэкстаў, стварэнне, апрацоўка, прэзентацыя | 30 хвілін | Трэнінг, семінар, педсавет | Дарослыя | Любая | Праектар для дэманстрацыі відэа | |

**МЭТА**

Практыкаванне праводзіцца для дарослай аўдыторыі, падыходзіць для стварэння добразычлівай спрыяльнай для навучання атмасферы. Удзельнікі праглядаюць мультфільм без гуку, ствараюць у групах свае дыялогі і агучваюць іх, потым параўноўваюць з арыгіналам і вызначаюць асноўны пасыл мультфільма. Рэкамендуецца ў якасці матыватара на трэнінгу для настаўнікаў, педсавеце.

## 1. ПРАГЛЯД МУЛЬТФІЛЬМА БЕЗ АГУЧВАННЯ

Трэнер дэманструе мультфільм, зняты паводле вядомага анекдота пра вырашэнне праблем.
Удзельнікі праглядаюць яго без гуку і адказваюць на пытанні трэнера, спрабуючы вызначыць аўтарскую ідэю мультфільма.

**— Дзе адбываюцца падзеі?**
**— З чым можа асацыявацца выбар месца падзей?**
**— Хто галоўныя героі?**
**— З якімі якасцямі асацыюецца кожны герой?**
**— Якія асаблівасці заўважалі пры адборы аўтарам герояў (леў — не жывёла лесу Еўропы);**
**— Які магчымы сацыяльны статус кожнага з герояў?**

## 2. РАБОТА Ў ГРУПАХ

а) Удзельнікі аб'ядноўваюцца ў групы (абавязковая ўмова: колькасць удзельнікаў групы адпавядае колькасці герояў мультфільма).
б) Пасля прагляду мультфільма (без агучвання) ўдзельнікі абмяркоўваюць тэму і вызначаюць змест дыялогу.
в) Удзельнікі кожнай групы размяркоўваюць ролі.
г) Адбываецца рэпетыцыя.
д) Кожная група прэзентуе тэатралізаваны дыялог пад дэманстрацыю мультфільма без агучвання.

## 3. ДЭМАНСТРАЦЫЯ МУЛЬТФІЛЬМА (З ГУКАМ), РЭФЛЕКСІЯ

Трэнер дэманструе арыгінал мультфільма з гукам.
Настаўнікі пазнаюць вядомы анекдот пра зайца, які не трапіў на сняданак ільву, таму што запытаўся, ці можна не прыходзіць. Трэнер просіць вызначыць яго меседж.

Удзельнікі аналізуюць арыгінальны змест дыялогу герояў, падводзяць вынікі, дзеляцца ўражаннямі, выказваюць меркаванні аб медыяадукацыйным складніку гэтага прыёму.

### ПАРАДЫ НАСТАЎНІКУ

- Калі пры першасным праглядзе без агучвання ўдзельнікі ўсё ж такі пазналі ў мультфільме экранізацыю вядомага анекдота, трэнер карэктуе заданне, каб яны стварылі дыялог, які мог бы адбыцца ў працоўным калектыве, на педсавеце або сярод удзельнікаў трэнінгу.

### АЎТАР

- Святлана Локіс

# Сняданак з героем

| #МЕДЫЯ | ЧАС | ПРАДМЕТ | КЛАС | ТЭМА | ПАДРЫХТОЎКА | ТУЛКІТ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Роля медыя, уплыў медыя на асобу і грамадства | 15 хвілін | Інфагадзіна | 5-11 | Медыясфера сучаснага грамадства | Дошка ці фліпчарт, маркеры | |

**МЭТА**

Удзельнікі вызначаць герояў, з якімі яны хацелі б паснедаць, прааналізуюць, колькі з герояў медыяперсон, і зразумеюць, наколькі думкі і паводзіны людзей залежаць ад медыясферы.

## 1. ВЫЗНАЧЭННЕ КОЖНЫМ СВАЙГО ГЕРОЯ

Настаўнік прапануе вучням вызначыць, з кім бы яны хацелі правесці 10 — 15 хвілін за сняданкам. Неабходна патлумачыць, што няма абмежаванняў (можна выбраць любую рэальную / гістарычную / фантастычную асобу мінулага, сучаснасці ці будучыні) і даць на абдумванне 3 хвіліны (можна папрасіць запісаць імя свайго героя на аркушы паперы).

## 2. АБМЕРКАВАННЕ ПЕРСАНАЛІЙ У ГРУПЕ

Настаўнік аб'ядноўвае вучняў у групы (5-6 чалавек) і прапануе пасля абмеркавання персаналій вылучыць аднаго героя ад кожнай групы (вынік запісваецца на дошцы). Потым збірае аркушы з імёнамі ўсіх герояў. Мяркуецца, што сярод прапанаваных асоб будуць кінаакцёры і кінагероі, папулярныя блогеры, поп-зоркі, рэперы, героі літаратурных твораў розных жанраў, персанажы коміксаў і анімэ, палітыкі, спартсмены.

## 3. АБМЕРКАВАННЕ ПЕРСАНАЛІЙ У КЛАСЕ

Настаўнік прапануе пытанні для абмеркавання:
— **Колькі з названых герояў мы ведаем толькі па медыя?**
— **Што можна сказаць пра ўплыў медыя на людзей?**
Плануецца, што вучні здолеюць абгрунтаваць высновы пра сучаснае медыяспажыванне і ролю медыя і масавай камунікацыі ў грамадстве.

### ПАРАДЫ НАСТАЎНІКУ

- Практыкаванне мэтазгодна правесці на пачатку заняткаў па медыяграматнасці. Яно добра падыходзіць для работы як з дзецьмі і падлеткамі, так і з педагогамі, дарослымі людзьмі.
  За час правядзення практыкавання адказы былі самыя розныя: у настаўнікаў перамагалі Шрэк, Уладзімір Караткевіч, Ала Пугачова, Джоні Дэп, Нік Вуйчыч і іншыя.
  Вучні называлі, як правіла, вядомых акцёраў, музычных куміраў, трапляўся і Стыў Джобс.
  Аднак амаль не было выпадку, каб нехта захацеў сустрэцца за сняданкам са сваёй прапрапрабабуляй ці з самім сабой у будучыні, каб запытацца пра сваё, блізкае, а не медыйнае. Удзельнікі лёгка рабілі высновы пра ўплыў медыя на нашы думкі, меркаванні, дзеянні і ўчынкі. Пасля падобных практыкаванняў міні-лекцыя пра медыя ўспрымаецца аўдыторыяй больш матывавана, бо кожны прымярае змест на свой асабісты досвед.

### АЎТАР

- **Алена Радзевіч**

# Акаўнт гістарычнай персоны ў сацсетках

| #МЕДЫЯ | ЧАС | ПРАДМЕТ | КЛАС | ТЭМА | ПАДРЫХТОЎКА | ТУЛКІТ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Уплыў медыя на асобу і грамадства, стварэнне, апрацоўка, прэзентацыя, сацыяльныя медыя | 45 хвілін | Грамада-знаўства, Гісторыя, Мастацтва, Літаратура, Інфармацыйная гадзіна | 5-11 | Біяграфія дзеяча | Доступ у інтэрнэт для работы з сацыяльнымі сеткамі, экран ці дошка для дэманстрацыі работ вучняў | |

**МЭТА**

Удзельнікі прааналізуюць інфармацыю, якую ўтрымлівае профіль карыстальніка пэўнай сацыяльнай сеткі, і створаць медыяпрофіль гістарычнай персоны.

## 1. ПАДРЫХТОЎЧЫ

Настаўнік у якасці дамашняга задання прапануе замест паведамленняў пра біяграфію пэўнага дзеяча (гістарычнай асобы, пісьменніка, навукоўца) зрабіць яго старонку ў любой сацыяльнай сетцы (на выбар). Галоўная ўмова — выкарыстанне гістарычных звестак і дадатковых матэрыялаў.
Крытэрыі паспяховасці выканання задання:

— Наяўнасць у медыяперсоны ніка і аватара.

— Наяўнасць тэкставай і візуальнай інфармацыі пра асобу (асабістыя звесткі, адукацыя, месца працы, вандроўкі, дасягненні, прачытаныя кнігі, музыка і інш.).

— Допіс пра што-небудзь важнае для гэтай асобы (рэакцыі, папулярнасць допісу).

**Для матывацыі вучняў можна паказаць наступны праект Daria Sazanovich:**




## 2. ПРЭЗЕНТАЦЫЯ РАБОТ І ІХ АБМЕРКАВАННЕ

Вучні прэзентуюць вынікі сваёй работы па стварэнні медыяпрофіля гістарычнай асобы. Перад прэзентацыяй можна прапанаваць пытанні, на якія варта звяртаць увагу:
— Што нам паведамляюць нік, аватар і персанальная інфармацыя пра характар асобы (адкрытасць ці закрытасць, добразычлівасць ці агрэсіўнасць, ганарлівасць ці сціпласць, сур'ёзнасць ці гарэзлівасць)?
— Што чалавек посціць у сетцы? Як гэта яго характарызуе?
— Якія словы выкарыстоўваюцца ў перапісцы?
— Гэты віртуальны вобраз прыцягвае ці адштурхоўвае?
— Ці можна ствараць акаўнты ад імя гістарычнай асобы ў сацыяльнай сетцы? Ці не будзе гэты акаўнт лічыцца фэйкавым?

**Парады настаўніку:**

- Для таго, каб пазбегнуць абвінавачанняў у стварэнні па сутнасці фэйкавых акаўнтаў, лепш карыстацца спецыяльнымі платформамі, якія імітуюць сацыяльныя сеткі, ці спецыяльнымі сэрвісамі.
Самае простае і эфектыўнае — працаваць з шаблонам сацыяльнай сеткі на папяровай аснове.
Найлепшы эфект для разумення алгарытмаў працы сацыяльных сетак — калі некалькі вучняў падрыхтавалі старонкі аднаго дзеяча ў розных сетках.
Напрыклад, медыяпрофілі Скарыны ў «Фейсбуку», «Вконтакте», «Інстаграм».

**АЎТАРЫ**

- **Таццяна Багдановіч, Алена Палейка**

# Ці можа быць БУЛІНГ памерам З КРАІНУ?

| #МЕДЫЯ | ЧАС | ПРАДМЕТ | КЛАС | ТЭМА | ПАДРЫХТОЎКА | ТУЛКІТ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Аналіз інфармацыі, стварэнне медыятэктсу | 90 хвілін | Трэнінг, класная гадзіна | Падлеткі, дарослыя | Булінг | Тры яблыкі (адзін з іх вельмі прыгожы), аркушы паперы А-4 і А-1, фламастары, ручкі, мультымедыйнае абсталяванне, доступ да інтэрнэту | |

**МЭТА**

Трэнінг дазволіць пашырыць разуменне прычын і выявіць асаблівасці праяваў булінгу, мобінгу і тэрору ў інфармацыйным грамадстве; будзе садзейнічаць фарміраванню крытычнага асэнсавання і праяўлення грамадзянскай пазіцыі ў адносінах да дыскрымінацыі, правоў чалавека; дапаможа выпрацаваць стратэгіі і прафілактычныя дзеянні для вырашэння праблем на падставе аналізу экранных медыя.

## 1. АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ЭТАП

Усе ўдзельнікі трэнінгу садзяцца ў кола.

## 2. АКТУАЛІЗАЦЫЯ ПРАБЛЕМЫ

Практыкаванне «Яблык».

Трэнер трымае на падносе тры яблыкі. Два з іх зялёныя, не вельмі прыгожыя, а трэці яблык вельмі прыгожы. Настаўнік выпадкова выпускае прыгожы яблык з рук, той коціцца па падлозе, яго падымаюць. Настаўнік просіць, каб яблык кінулі яму ў рукі, але ён  зноў падае, настаўнік спыняе яго нагой. Прапануе выкарыстаць гэты яблык у якасці эстафетнай палачкі і, перакідваючы адзін аднаму, павітацца (распавесці навіну ці прадставіцца).

Пасля гэтых маніпуляцый настаўнік кладзе гэты яблык побач з астатнімі і прапануе  прысутным паглядзець караткаметражны фільм «Маленькі кавалачак крэйды»

Пасля прагляду трэнер задае пытанне:

— Што агульнага паміж вось гэтым яблыкам і галоўным героем фільма, які мы з вамі паглядзелі? Прысутныя прыходзяць да высновы, што яблык і хлопчык (галоўны герой фільма) з’яўляюцца ахвярамі  дрэннага стаўлення з боку людзей.

— У чым праяўляецца дрэннае стаўленне? Ці заслугоўваюць яго хлопчык і яблык?

— Ці з’яўляецца гэта нормай? Ці трэба сёння пра гэта гаварыць? Чаму?

Трэнер прадстаўляе тэму трэнінгавага занятку, у якую ўключана ключавое пытанне **«Ці можа быць булінг памерам з краіну?»,** і прапануе паспрабаваць разам на яго адказаць.

## 3. ПАГРУЖЭННЕ Ў ПРАБЛЕМУ

На дошцы (экране) тры словы: БУЛІНГ, МОБІНГ, ТЭРАРЫЗМ

Трэнер задае пытанне прысутным:

– Што агульнага ў гэтых паняццях і чым яны адрозніваюцца? Хто гатовы іх параўнаць?

Трэнер прапануе разабрацца, што ёсць што, арганізаваўшы работу ў групах.

Практыкаванне «Кругі Эйлера»

**Кругі Эйлера** — гэта геаметрычная схема, якая дапамагае знаходзіць і / або рабіць больш нагляднымі лагічныя сувязі паміж з'явамі і паняццямі. А таксама дапамагае адлюстраваць суадносіны паміж якім-небудзь мноствам і яго часткай.




Усе прысутныя дзеляцца на пяць груп. Кожная атрымлівае ліст паперы, на якім намаляваныя кругі Эйлера. Выкарыстоўваючы гаджэты, удзельнікі вядуць пошук інфармацыі і фіксуюць яе на лістах паперы, вызначаючы агульнае і адрознае ў з'явах. На гэту работу адводзіцца 10 хвілін.
Пасля заканчэння часу прадстаўнік кожнай групы прэзентуе вынік сумеснай працы на падставе параўнальнага аналізу ў выглядзе кругоў Эйлера.
Усе групы прыходзяць да высновы, што агульным ва ўсіх гэтых паняццях з'яўляюцца гвалт, цкаванне, агрэсія ў дачыненні да іншых, а адрозніваюцца яны маштабнасцю, узростам удзельнікаў і мэтамі.
Булінг — англ. Bullying — агрэсіўны пераслед аднаго з членаў калектыву з боку іншага ці групы асоб, не абавязкова з аднаго фармальнага калектыву (асабліва гэта з'ява характэрная для калектыву школьнікаў і студэнтаў, але можа тычыцца і калег).
Мобінг (ад англ. Mob — агрэсіўны натоўп, банда) — форма псіхалагічнага гвалту ў выглядзе цкавання супрацоўніка ў калектыве, як правіла, з мэтай яго наступнага звальнення.
Тэрарызм — працэс дасягнення палітычных, ідэалагічных, эканамічных і рэлігійных мэт гвалтоўным шляхам.
Сінонімамі слова «тэрор» (лац. Terror - страх, жах) з'яўляюцца словы «гвалт», «запалохванне», «застрашванне».
Для таго, каб упэўніцца ў зробленых высновах, трэнер прапануе паглядзець відэафрагменты, якія дэманструюць праяўленне булінгу, мобінгу і тэрарызму.
Трэнер папярэджвае быць уважлівымі, бо трэба будзе вызначыць від цкавання.

**назва фільма «Асабліва небяспечны»**

Пытанні пасля прагляду кожнага з ролікаў:
— Да якога віду цкавання адносяцца прадэманстраваныя дзеянні?
— Як праяўляецца цкаванне?
— Хто яго ахвяры?
— Якія наступствы яно мае?
Прагляд відэаролік:

**фрагмент з фільма «Целаахоўнік кілера»**

Прагляд відэароліка:

**фрагмент з фільма «Пудзіла»**

Прагляд відэаролікаў:

**фрагменты з фільмаў: «Гары Потэр і Ордэн Фенікса», «Гары Потэр і Дары Смерці»**

## 4. АБАГУЛЬНЕННЕ МАТЭРЫЯЛУ ПА ПРАБЛЕМЕ

Практыкаванне «Пошук»
Трэнер арганізуе работу ў пяці групах.
Кожнай групе неабходна адказаць на адно з наступных пытанняў:
1. У чым асаблівасці сучаснага булінгу, мобінгу, тэрору?
2. Віды  булінгу, мобінгу, тэрору?
3. У чым прычыны булінгу, мобінгу, тэрору?
4. Хто лічыцца ўдзельнікам булінгу, мобінгу, тэрору?
5. Як змагацца з булінгам, мобінгам, тэрорам?
Для пошуку адказаў на пытанні кожная група атрымлівае матэрыял-арыенцір (гл. дадатак), магчымасць скарыстацца інтэрнэт-рэсурсамі і сваім жыццёвым вопытам. Кожная група атрымлівае аркуш паперы А-1 з выявай табліцы, куды трэба  ўпісаць напрацаваную інфармацыю па сваім пытанні

| БУЛІНГ | МОБІНГ | ТЭРАРЫЗМ |
|---|---|---|
| | | |

**Заўвага:** матэрыял-арыенцір закранае праблему булінгу, а астатнія паняцці разглядаюцца па ўзору з дапамогай іншых крыніц інфармацыі.
Па выніках абмеркавання кожная група рыхтуе прэзентацыю сваіх напрацовак. Прадстаўнікі груп выступаюць па чарзе, замацаваўшы свае лісты на дошцы (сцяне).

## 5. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ

Трэнер падводзіць вынікі трэнінгу, разважаючы аб тым, што так склалася, што аб праблеме мы пачынаем гаварыць, калі яна ўжо выклікае пагрозу, калі ў яе ўцягнута вялікая колькасць удзельнікаў, калі на праблему ўжо немагчыма закрыць вочы, а неабходна нешта вырашаць і рабіць… Трэнер прапануе пагаварыць аб тым, як не дапускаць гэтых праблем, як ва ўмовах сям'і, школы, працоўнага калектыву і грамадства весці прафілактыку цкавання. Звяртае ўвагу, што ў час інфармацыйнага грамадства тэрор робяць масавым СМІ. Улада праводзіць паказальныя працэсы над знакавымі асобамі, можа прэвентыўна затрымаць і катаваць у турмах дэмакратычных актывістаў, а задача падуладных СМІ пра гэта распавесці як мага большаму колу людзей. Эфект запалохвання будзе такі ж, як ад сталінскага «Вялікага тэрору».
Інтэрактыўнае практыкаванне «Супольнасці».
Калектыў удзельнікаў дзеліцца на пяць груп-суполак: «Дзеці», «Сям'я», «Педагагічны калектыў», «Працоўны калектыў», «Грамадства».
Творчае заданне для груп-суполак:
1. Распрацаваць **ПРАВІЛЫ ПАВОДЗІН** дома, у школе, на вуліцы для прафілактыкі булінгу.
2. Распрацаваць **МЕМАРАНДУМ ВЫХАВАННЯ** дзіцяці для бацькоў, які гарантуе выхаванне ўстойлівай да булінгу, мобінгу і тэрору асобы.
3. Распрацаваць **ЗВОД ПЕДАГАГІЧНЫХ ПРАВІЛАЎ** для настаўнікаў па арганізацыі прафілактычных дзеянняў супраць булінгу ў дзіцячым калектыве.
4. Распрацаваць **ЗАКОНЫ СУПРАЦОЎНІЦТВА** ў працоўным калектыве, якія дазваляюць пазбегнуць праяўлення мобінгу.
5. Распрацаваць **КОМПЛЕКС МЕРАПРЫЕМСТВАЎ** грамадскага ўзроўню, рэалізацыя якіх дапаможа не дапусціць тэрор.
На выкананне задання групам даецца 15 хвілін.
Пасля заканчэння часу (ці па меры падрыхтаванасці груп) кожная прадстаўляе свой праект.
Трэнер робіць акцэнт на тое, што ўдзельнікі падышлі да ключавога пытання, прапануе ім адказаць на яго і шэраг іншых пытанняў:
**— Ці можа быць булінг памерам з краіну?**
**— Як называецца булінг такога маштабу?**
**— Як вы думаеце, ці ёсць залежнасць паміж булінгам і тэрорам?**
**— Ці можна ў будучыні пазбегнуць тэрору? Як?**
**— Што кожны з нас можа зрабіць, каб знізіць рызыку праяўлення булінгу, мобінгу і тэрору ў дзіцячым калектыве, на працоўным месцы, у краіне?**

## 6. РЭФЛЕКСІЯ

Практыкаванне «Працягні сказ»
На дошцы (экране) прапануюцца тры незакончаныя сказы:
«На сёняшнім занятку я зразумеў, што…»
«На сёняшнім занятку я навучыўся…»
«Пасля сённяшняга занятку я змагу…»

**ПАРАДЫ НАСТАЎНІКУ**

- Праводзячы трэнінг, настаўніку трэба ўвесь час арыентавацца і звяртаць удзельнікаў на пажаданыя вынікі. Гэта адбываецца з дапамогай дадатковых пытанняў, якія не дазваляюць удзельнікам адхіляцца ад тэмы.

**Аўтар**

- **Міхась Кудзейка**

### РАЗДАТАЧНЫ МАТЭРЫЯЛ ДА ПРАКТЫКАВАННЯ «ПОШУК».

### Група 1. АСАБЛІВАСЦІ СУЧАСНАГА БУЛІНГУ

Сучасны булінг ускладняецца актыўнасцю падлеткаў у сацыяльных сетках. Дзеці не проста здзекуюцца, а запісваюць здзекі на відэа і распаўсюджваюць яго потым у інтэрнэце. Не выключана, што ў некаторых выпадках ідэя зняць відэа («хайпануць») з'яўляецца першаснай, а ўжо затым вышукваецца ахвяра і складаецца сцэнар «крутога» відэа. Дзеці да 14 гадоў вылучаюцца асаблівай жорсткасцю, бо не баяцца крымінальнай адказнасці (відэа – прамы доказ). Мала хто з агрэсараў прызнае сваю віну, часцей гучыць «ён заслужыў», «ён сам вінаваты».

Іншыя асаблівасці булінгу ў нашы дні:

— У сярэдніх і старэйшых класах распаўсюджана ўскосная траўля.

— Дзяўчаты часцей бываюць уцягнутыя ў булінг, чым хлопцы. Але яны часцей становяцца назіральнікамі. Часцей пакутуюць ад плётак, негатыўных выказванняў і жэстаў.

— А хлопцы часцей падвяргаюцца фізічнаму гвалту, пагрозам, прымусу, крадзяжу рэчаў. Яны часцей бываюць «хамелеонамі».

— 89% навучэнцаў сутыкаюцца з булінгам. З іх 8% — агрэсары, 22% — ахвяры, 43% — «хамелеоны» і 16% — назіральнікі.

### Група 2. ВІДЫ БУЛІНГУ

Булінг бывае прамым і ўскосным. Першы тып прадугледжвае адкрытае ўздзеянне, збіццё, абразы ў твар. Другі тып — гэта скрытыя здзекі, напрыклад, распаўсюджванне чутак або абвяшчэнне байкоту чалавеку. Па спецыфіцы зместу можна вылучыць:

• Фізічны булінг: збіццё, штуршкі, пляўкі, захоп рэчаў. Гэта самы распаўсюджаны тып булінгу.
• Вербальная траўля: мянушкі, пагрозы, абразы, насмешкі, прымус, прыніжэнне.
• Сацыяльна-псіхалагічны булінг: плёткі і чуткі, ігнараванне, выключэнне з групы і агульных спраў, выстаўленне на пасмешышча, байкот і ізаляцыя, маніпуляцыі. Гэты тып актуальны для ўсіх узростаў, але часцей за іншыя застаецца незаўважаным. Між іншым, менавіта сацыяльна-псіхалагічны булінг выклікае наймацнейшы эмацыянальны стрэс у ахвяры.
• Электронны (віртуальны) булінг. Адбываецца цкаванне праз тэлефон і камп'ютар, электронную пошту, інтэрнэт. Віртуальны булінг не залежыць ад узросту, мае на ўвазе распаўсюджванне чутак і ілжывай інфармацыі, узлом старонак, адпраўку негатыўных паведамленняў і каментароў, выкраданне і распаўсюджванне фатаграфій, асабістых дадзеных.

### Група 3. ПРЫЧЫНЫ БУЛІНГУ

Булінг — неадэкватная асацыяльная спроба самасцвярджэння. Да сапраўдных матываў агрэсараў адносяцца прыцягненне ўвагі, дэманстрацыя сілы, утойванне няўпэўненасці і страхаў, задавальненне патрэбы ва ўладзе і дамінаванні. А.А. Рэан распрацаваў наступную класіфікацыю матываў (прычын) булінгу:

• Імкненне да ўлады. Некаторыя індывіды маюць патрэбу ў дамінаванні, пры незадавальненні якой пакутуюць ад пачуцця пройгрышу.
• Агрэсія. Самы папулярны тып завадатараў – жорсткія людзі, як правіла, з высокім сацыяльным статусам і высокай самаацэнкай.
• Трывожнасць. Крыўдзіцель сам баіцца апынуцца на месцы ахвяры, з-за чаго абараняецца нападам. Альтэрнатыўная назва дадзенага тыпу – «хамелеоны». Пры пэўным збегу абставінаў яны могуць быць як агрэса-рамі, так і ахвярамі. Нярэдка агрэсарамі становяцца былыя ахвяры. Усё залежыць выключна ад знешніх умоў і абставін.
• Пасіўныя булі. Яны падобныя на папярэдні тып, але не баяцца апынуцца ў ролі ахвяры, а хочуць заслужыць аўтарытэт і прызнанне ў калектыве. Ім недаступныя іншыя спосабы самасцвярджэння.

## Група 4. АСАБЛІВАСЦІ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ БУЛІНГУ

Ахвяра, агрэсар і назіральнікі (удзельнікі булінгу) маюць шэраг псіхалагічных асаблівасцей.
**АХВЯРА.** Ахвярамі часцей становяцца трывожныя, крыўдлівыя, няўпэўненыя ў сабе, схільныя да слёз дзеці. У ахвяр нізкі ўзровень самапавагі, яны занадта нерашучыя, каб даць адпор. Групу рызыкі складаюць дзеці з сіндромам гіперактыўнасці, прыкметамі аўтызму, дыябетам, цяжкасцямі ў навучанні, любымі хранічнымі і вострымі захворваннямі або фізічнымі асаблівасцямі.
Яшчэ адна катэгорыя ахвяр — свядомыя правакатары. Дарэчы, яны ж часта выступаюць адразу ў дзвюх ролях (у розных умовах): ахвяры і агрэсара. Для ахвяр-агрэсараў характэрны слабы самакантроль, нізкая сацыяльная кампетэнтнасць, трывожнасць і дэпрэсіўнасць, цяжкасці ў вучобе і школьнай адаптацыі. Гэта самая нешматлікая група, але самая складаная.
**АГРЭСАРЫ.** Агрэсары вылучаюцца гатоўнасцю да самасцвярджэння праз гвалт. Яны з цяжкасцю прымаюць чужыя правілы, неўраўнаважаныя. Здольныя адчуваць іншых людзей, маніпуляваць іх эмоцыямі і станамі. Агрэсары не рэагуюць на крытыку, схільныя да лідарства. Прычына агрэсіўнасці крыецца ў неадпаведнасці рэальнасці і меркавання агрэсара пра сябе. Яны застаюцца недаацэненымі ва ўласным разуменні, што і выклікае ў іх раздражненне.
**НАЗІРАЛЬНІКІ.** Самая вялікая катэгорыя ўдзельнікаў булінгу. Амаль усе назіральнікі адзначаюць, што ім шкада ахвяру, але толькі менш за палову гатовыя ёй дапамагчы. Падобныя паводзіны цалкам тлумачальныя: запярэчыўшы агрэсару, сведка сам можа апынуцца пад ударам. Назіральнікі часта адчуваюць страх і сорам, пакутуюць ад пачуцця бездапаможнасці, часам жадаюць далучыцца да агрэсара. Калі булінг доўжыцца працяглы час, у пасіўных назіральнікаў узровень эмпатыі падае.

## Група 5. ЯК ЗМАГАЦЦА З БУЛІНГАМ

Праблема булінгу застаецца вострай, бо пакуль не ўстаноўлена сістэма актыўных і эфектыўных спосабаў яго выяўлення і стрымлівання. Ускладняе сітуацыю тая акалічнасць, што людзі не рэагуюць на булінг, калі іх гэта не тычыцца. Ды і самі ахвяры часцей маўчаць. Дарослыя нярэдка ігнаруюць праблему, што дае падставы падлеткам практыкаваць падобную мадэль паводзін і ўспрымаць яе як норму. Дадзеная мадэль засвойваецца з пакалення ў пакаленне. Булінг — толькі адлюстраванне стану грамадства. На прыватным узроўні з ім змагацца бессэнсоўна, але можна карэктаваць падобныя праявы. Неабходна даць адпор крыўдзіцелю. Для гэтага трэба прытрымлівацца наступных правілаў:
• Прызнайце праблему, называйце рэчы сваімі імёнамі.
• Звярніцеся да чалавека, з якім склаліся даверлівыя адносіны. Раскажыце яму аб праблеме.
• Не дазваляйце агрэсару кіраваць вашымі пачуццямі. Вызначце, якіх рэакцый ён ад вас чакае, і не давайце яму гэтых рэакцый. Не рэагуйце на яго.
• Навучыцеся казаць «не» ці адказваць на фізічную сілу. Часта агрэсару трэба ўсяго толькі адзін раз даць адпор.
• Агучвайце праблему, стварыце групу падтрымкі. Усвядомце сумесную сілу.

# Беларуская мова, 5 клас, першы ўрок «Чалавек і мова»

| #МЕДЫЯ | ЧАС | ПРАДМЕТ | КЛАС | ТЭМА | ПАДРЫХТОЎКА | ТУЛКІТ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Дэкадаванне медыя-тэкстаў,мова медыя,уплыў медыя на асобу і грамадства | 45 хвілін | Беларуская мова | 5 | Чалавек і мова. Камунікатыў-ныя функцыі мовы. | Падручнік, раздрукоўка малюнкаў | |

**МЭТА**

Першы ўрок у V класе. Вучні знаёмяцца са структурай і зместам падручніка, паняццямі «камунікатыўная функцыя мовы», «мэта і адрасат маўлення», рознымі спосабамі перадачы інфармацыі, а таксама вучацца дэкадаваць інфармацыю, адлюстраваную на вокладцы падручніка і на фотаздымку.

## 1. ІНФАРМАЦЫЯ ДЛЯ НАСТАЎНІКА

Гэта першы ўрок беларускай мовы ў 5 класе. Вучні ведаюць, што мова — уласцівасць чалавека, служыць для зносін. Маюць першапачатковыя навыкі вызначэння тэмы і асноўнай думкі тэксту.

**Мэта настаўніка на ўрок**

Плануецца, што вучні:

**будуць ведаць** структуру і змест падручніка, змест паняццяў «камунікатыўная функцыя мовы», «сродкі масавай камунікацыі», «медыя», «мэта і адрасат маўлення»; розныя спосабы перадачы інфармацыі;

**змогуць** вызначыць мэту і асноўную думку тэксту, скласці дыялог па прапанаваным малюнку;

**змогуць** дэкадаваць інфармацыю, адлюстраваную на вокладцы падручніка і на фотаздымку.

**Ключавое пытанне**

«Уявіце сабе, што чалавек не ўмее гаварыць. Магчыма, калі б не было мовы, то не было б і сварак, войнаў, бо людзі не маглі б пасварыцца, пакрыўдзіць, абразіць. Гэта так ці не?»




## 2. АРЫЕНЦІРОВАЧНА-МАТЫВАЦЫЙНЫ ЭТАП УРОКА

1. Знаёмства настаўніка з вучнямі.

Настаўнік агучвае мэту ўрока, потым гаворыць, што спачатку хоча даведацца, наколькі кемлівыя вучні ў пятым класе і, папрацаваўшы ў парах, прапануе адгадаць загадкі:

У адным клубочку сем дзірачак (галава).

За сцяной касцяной салавей шчабеча (язык).

З дабром скажу — салодкае, са злом скажу — горкае (слова).

Крылаў не мае, а лётае: выпусціш — не зловіш (слова).

Якой тэмай аб'яднаны адгадкі? (Чалавек і мова).

Настаўнік абагульняе, што ўсе загадкі пра мову, якую дзеці будуць вывучаць, каб разумець іншых і прыгожа гаварыць.

2. Гутарка па пытаннях:
1. Якая розніца паміж здольнасцямі чалавека і жывёлы?
2. Якія ўмовы неабходны для таго, каб чалавек навучыўся гаварыць?
3. Для чаго даецца мова чалавеку?
4. З якой мэтай гаворыць чалавек?
5. Уявіце сабе, што чалавек не ўмее гаварыць. Магчыма, калі б не было мовы, то не было б і сварак, войнаў, бо людзі не маглі б пасварыцца, пакрыўдзіць, абразіць?
На пятае пытанне вучні не знаходзяць адказ, настаўнік прапануе звярнуцца да яго напрыканцы ўрока.

## 3. АПЕРАЦЫЙНА-ПАЗНАВАЛЬНЫ ЭТАП УРОКА

1. Вучні знаёмяцца з падручнікам. Потым у парах абмяркоўваюць і знаходзяць адказы на наступныя пытанні:
1. Якую інфармацыю нясе вокладка падручніка? Пра што яна нам гаворыць?
2. Якія выявы на ёй змешчаны?
3. Якія колеры пераважаюць і чаму?
4. Ці можам мы з першага позірку зразумець, што перад намі менавіта падручнік па беларускай мове? Што нам у гэтым дапамагае?

2. Вучні абмяркоўваюць у парах, а потым франтальна выяву помніка на вокладцы:
1. Які помнік мы бачым на вокладцы?
2. Дзе ўсталяваны помнік? Чаму менавіта ў гэтым горадзе?
3. Што вы ведаеце пра літару «Ў»?
4. У чым значэнне помніка для культуры нашай краіны?
5. Чаму менавіта гэты помнік быў абраны для вокладкі падручніка па беларускай мове?
6. Якую агульную выснову вы можаце зрабіць?

3. Настаўнік абагульняе: «Бачыце, як шмат вы даведаліся, разглядаючы вокладку падручніка. Значыць, перадаваць і атрымліваць паведамленні можна не толькі праз маўленне. І не толькі ад чалавека — чалавеку. Кнігі, газеты, тэлебачанне, інтэрнэт таксама з намі размаўляюць (камунікуюць), гэта «сродкі масавай камунікацыі». Масавай — таму што яны камунікуюць з многімі людзьмі. Іх яшчэ называюць «медыя». Бо ў перакладзе «медыя» — пасярэднік, г. зн. кніга – пасярэднік паміж аўтарамі, якія яе стварылі, і чытачамі. Медыя нам перадаюць інфармацыю ад іншых людзей, якіх мы можам і не ведаць»
Якія медыя вы ведаеце? (Газеты, кнігі, тэлебачанне, радыё, кіно, інтэрнэт, рэкламныя абвесткі, афішы, білборды...)
Вакол нас шмат медыя і шмат крыніц інфармацыі, і кожны від медыя мае сваю «мову»: выявы, кадры ў кіно, музыка, колер... Патрэбна толькі ўважліва прыглядацца і навучыцца яе разумець.
4. Работа вучняў з практыкаваннем №2 падручніка.
Вучні выразна чытаюць тэкст практыкавання, вызначаюць тэму і асноўную думку. Тлумачаць, як яны разумеюць сэнс паняцця «камунікатыўная функцыя мовы».
Настаўнік звяртае ўвагу на фразу «Разумелі людзі і такую функцыю мовы, як уздзеянне, здольнасць слова выклікаць у слухача пэўныя эмоцыі». Дадае, што эмоцыі могуць выклікаць не толькі добрыя ці злыя словы, але і музыка (гукі), выявы. І гэтым карыстаюцца розныя медыя: напрыклад, у рэкламе, каб прадаць тавар, можа выкарыстоўвацца прыемная музыка, усмешкі, прыгожыя людзі, выявы смачнай ежы... Паглядзім, якія эмоцыі нам перадаюць малюнкі без слоў.
5. Практыкаванне «Складзі дыялог па малюнках» (работа ў парах)
Вучні разглядаюць выявы, на якіх адлюстраваны пэўныя сітуацыі. Настаўнік прапануе звярнуць увагу на постаці людзей, іх настрой, міміку, жэсты.





Па просьбе настаўніка вучні выбіраюць фатаграфію і па ёй будуюць дыялогі з чатырох пытанняў і адказаў, агучваюць некалькі дыялогаў, аналізуюць на адпаведнасць прапанаванай сітуацыі, выбранай інтанацыі, лексічным сродкам і г.д.

6. Праца вучняў у групах па тэме «Альтэрнатыўная» мова.
Настаўнік распавядае, што альтэрнатыўная мова (музыка, колер, шрыфт, выявы) ёсць не толькі ў медыя, але і ў людзей:
Група 1 «Мова жэстаў» — практыкаванне №5.

Група 2 «Кнігі для сляпых» — практыкаванне №6.

Прадстаўнікі груп сцісла пераказваюць змест прачытанага і адказваюць на пытанні:
1) Каму адрасаваны тэкст і з якой мэтай?
2) Ці можа «альтэрнатыўная» мова стаць асноўным сродкам зносін людзей?

## 4. АЦЭНАЧНА-РЭФЛЕКСІЎНЫ ЭТАП УРОКА

Настаўнік вяртае вучняў да ключавога пытання: «Магчыма, калі б не было мовы, то не было б і сварак, войнаў, бо людзі не маглі б пасварыцца, пакрыўдзіць, абразіць?» Ці змянілася ваша меркаванне і як?
Напрыканцы ўрока вучні адказваюць на пытанні:
З якімі новымі тэрмінамі пазнаёміліся на ўроку? Патлумачце іх сэнс.
Як чалавек можа атрымліваць інфармацыю, з якіх крыніц?
Настаўнік агучвае мэту ўрока, вучні паказваюць колерам светлафора ці іншым чынам, ці дасягнулі яны мэты.

## 5. ДАМАШНЯЕ ЗАДАННЕ

**На выбар:**
— Папрасіце вашых бацькоў, каб яны дапамаглі вам знайсці ў інтэрнэце па два выказванні беларускіх паэтаў ці пісьменнікаў пра родную мову.
— Абмяркуйце з бацькамі, чаму родная мова ва ўсіх народаў з'яўляецца нацыянальнай каштоўнасцю і аберагаецца дзяржавай. Запішыце тры аргументы, чаму мы павінны ведаць сваю мову.

## ПАРАДЫ НАСТАЎНІКУ

- Практыкаванне па дэкадаванні вокладкі падручніка, кнігі, часопіса можна правесці на любым прадмеце або інфармацыйнай гадзіне.

## АЎТАР

- **Таццяна Зямлянік**

# Беларуская літаратура, 9 клас. Янка Купала «Бандароўна»



| #МЕДЫЯ | ЧАС | ПРАДМЕТ | КЛАС | ТЭМА | ПАДРЫХТОЎКА | ТУЛКІТ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Мова медыя, дэкадаванне медыя-тэкстаў | 45 хвілін | Беларуская літаратура | 9 | Янка Купала «Бандароўна» | План паэмы | |

## МЭТА

Да завяршэння ўрока вучні будуць ведаць сюжэт паэмы, змогуць параўнаць вобразы гусляра («Курган») і Машэкі, Натанькі («Магіла льва») і Бандароўны, змогуць знайсці адказ на ключавое пытанне: «Чаму паэма «Бандароўна» напісана на аснове ўкраінскай народнай песні, а не айчыннага фальклору? Ці актуальная дагэтуль паэма?»
Матэрыял урока паспрыяе фарміраванню грамадзянскай пазіцыі дзевяцікласнікаў.
Медыйная мэта на ўрок: вучні змогуць параўнаць ментальнасць украінскага і беларускага народаў праз пасылы, якія зашыфраваны ў беларускім і ўкраінскім фальклоры.

## 1. АПОРНЫЯ ВЕДЫ, ВЫХАД НА КЛЮЧАВОЕ ПЫТАННЕ

Настаўнік паведамляе, што паэма, напісаная больш як 100 год таму, дагэтуль застаецца папулярнай, бо ў інтэрнэт-прасторы ёсць мемы, дэматыватары на яе сюжэт. І прапануе пазнаёміцца з адным з іх.




Яшчэ адна загадка: Купала добра ведаў беларускі фальклор, але напісаў сваю паэму на сюжэт украінскай народнай песні пра Бандароўну. Чаму?
Настаўнік да канца ўрока прапануе разам знайсці адказ на гэтыя два пытанні:
Чаму паэма напісана Купалам на аснове ўкраінскай народнай песні, нягледзячы на добрае веданне паэтам беларускай вуснай народнай творчасці?
Чаму яна дагэтуль мае папулярнасць у сучаснай беларускай моладзі?

Настаўнік арганізуе мазгавы штурм.
Вучні, абапіраючыся на псеўданім паэта, на раней прачытаныя паэмы, спрабуюць вызначыць творчую манеру Янкі Купалы, важныя для паэта тэмы, каштоўнасці, якія ён апяяў.
Настаўнік запісвае на дошцы выказванні вучняў і падагульняе.

Купала адзін з першых у беларускай літаратуры заўважыў, што чалавек — істота даволі недасканалая ў маральным плане. Паэт бачыў пільную патрэбу ў героях, якія б адчулі смак свабоды, таму шукаў іх у народных легендах, песнях, паданнях. Свабодны чалавек, на думку Купалы, ужо не згодны будзе трапіць пад уціск іншага. Каштоўнасць свабоды праяўляецца ў сітуацыі найбольшай небяспекі. У экстрэмальных жыццёвых сітуацыях правяраюцца і героі купалаўскіх паэм «Курган» і «Магіла льва».

## 2. ВЫВУЧЭННЕ СЮЖЭТА ПАЭМЫ.

Вучні атрымліваюць ад настаўніка назвы частак паэмы, размешчаныя ў хаатычным парадку:
Уцёкі Бандароўны ад гневу пана.
Прапанова пана.
Пахаванне Бандароўны.
Помста Патоцкага.
Выбар Бандароўны.
Знаёмства чытача з Бандароўнай.
Канфлікт паміж панам і Бандароўнай.
Помста народа.
Спроба Патоцкага загладзіць сваю віну.
Знаёмства чытача з панам Патоцкім.
Панская хеўра палоніць дзяўчыну.

Заданне.
Пранумараваўшы часткі твора, размясціце іх у лагічнай паслядоўнасці, каб быў звязны сюжэт. У якасці апоры вучні могуць карыстацца падказкай «Як будуецца эпічны твор».

Вучні спачатку выконваюць заданне індывідуальна, потым у парах, потым у групах (суседнія парты).
Важна, каб групы прыйшлі да адзінага варыянту размяшчэння частак.
Настаўнік прапануе зверыць вынікі з аўтарскай логікай пабудовы сюжэту.

Правільнае размяшчэнне фрагментаў твора:
1. Знаёмства чытача з панам Патоцкім.
2. Знаёмства чытача з Бандароўнай.
3. Канфлікт паміж панам і Бандароўнай.
4. Уцёкі Бандароўны ад гневу пана.
5. Панская хеўра палоніць дзяўчыну.
6. Прапанова пана.
7. Выбар Бандароўны.
8. Помста Патоцкага.
9. Спроба Патоцкага загладзіць сваю віну.
10. Пахаванне Бандароўны.
11. Помста народа.

Як правіла, узнікае шмат пытанняў «Чаму?». Настаўніку трэба быць гатовым да тлумачэння аўтарскай інтэрпрэтацыі падзей.

## 3. КЕЙС

Настаўнік прапануе ўзгадаць мем, паказаны напачатку ўрока, і адказаць на пытанне, ці перадае ён сюжэт паэмы?
Настаўнік паведамляе, што ў інтэрнэце ёсць і такі сціслы пераказ сюжэту паэмы Янкі Купалы «Бандароўна»: «Патоцкі са сваёй «хеўрай лядочай» ездзіў па Украіне, свавольнічаў, крыўдзіў бедны народ. На вечарынцы ў карчомцы пан сустрэў прыгожую Бандароўну і захацеў абняславіць яе. Калі Патоцкі пачаў прыставаць да дзяўчыны, яна не стрывала і «заехала па твары». За гэта ганарлівы пан застрэліў Бандароўну.»
Ці можаце вы пагадзіцца з правільнасцю такога сціслага пераказу паэмы? Чаму?
Магчымыя адказы:
Так.
Не, канфлікт паэмы намнога глыбей…
Амаль што, але аўтар пераказу прапусціў важны момант…

## ПРАВЯРАЕМ НАДЗЕЙНАСЦЬ І ДАКЛАДНАСЦЬ ІНФАРМАЦЫІ

1. На якім сайце апублікавана інфармацыя?
   Што можна сказаць пра гэты сайт?
2. Ці згадваецца крыніца інфармацыі?
   Што можна пра яе сказаць?
3. Хто аўтар інфармацыйнага паведамлення?
   Каму яно адрасавана?
4. Ці прыводзяцца факты?
   Якія аргументы выкарыстоўваюцца?
   Ці ёсць у тэксце памылкі?
5. Вызначыце мэту гэтага паведамлення.
   Для чаго яно створана?
   Калі яно было створана (дата)?
6. Знайдзіце ў сеціве падобныя паведамленні
   (паведамленні па гэтай тэме), выкарыстайце
   розныя камбінацыі ключавых слоў у запыце.
7. Параўнайце інфармацыю з розных крыніц.
   Зрабіце выснову, ці можна давяраць гэтай інфармацыі.

## НА ШТО НЕАБХОДНА ЗВЯРНУЦЬ УВАГУ ПРЫ ЧЫТАННІ НАВІН (ЯК РАСПАЗНАЦЬ ФЭЙКІ)

1. Якія эмоцыі выклікае ў вас гэта паведамленне?
Ці можа яно вас раззлаваць, выклікаць абурэнне, нешта навязаць або прадаць?
(Якасныя навіны не ўтрымліваюць эмацыйна-афарбаванай лексікі і ацэнак,
а падаюць толькі факты).

2. Звяртайце ўвагу на загаловак.
Ці адпавядае ён інфармацыі ў тэксце?
Ці ўтрымлівае катэгарычныя сцвярджэнні?
Абяцае сенсацыю?

3. Абавязкова прачытайце тэкст цалкам, каб сфарміраваць пра яго сваё меркаванне.
Ці сустракаюцца ў тэксце памылкі, супярэчнасці?

4. Калі навіна трапіла да вас з сацыяльнай сеткі,
ці ведаеце вы, дзе яна была апублікавана ўпершыню?
Ці ведаеце вы таго чалавека,
са старонкі якога даведаліся пра навіну?

5. Ці ёсць выява, якая ілюструе тэкст?
Што можна сказаць пра гэту выяву (месца здымкі, ракурс фатаграфіі і інш.).
Ці мае фота адносіны да інфармацыі ў тэксце?

6. Ці вядомы рэсурс, на якім апублікаваная навіна?
Ці падпісаўся аўтар паведамлення?

7. Ці ёсць спасылкі на першакрыніцу, на афіцыйныя рэсурсы
(у выпадку неабходнасці), на экспертнае меркаванне?

## ЯК АДДЗЯЛІЦЬ ФАКТЫ АД МЕРКАВАННЯЎ У МЕДЫЯ

# 1 ФАКТЫ

Факты ўтрымліваюць інфармацыю аб тым, што, дзе, калі адбылося, лічбы, вынікі даследаванняў і да т.п.
— факт — тое, што адбылося ў рэальнасці, зафіксавана, можна праверыць і пацвердзіць іншымі фактамі
— факт не дае ніякіх ацэнак ці заклікаў да чаго-небудзь

# 2 МЕРКАВАННІ

Меркаванне ў тэксце можна знайсці ў выглядзе каментара, здагадкі, высновы, ацэнкі і г.д.
— меркаванне заўсёды выказвае суб'ектыўнае стаўленне, эмацыйна афарбавана, можа ўтрымліваць заклік да дзеяння
— адрозніць меркаванне ад фактаў можна з дапамогай слоў-маркераў, якія дапамагаюць распазнаць наяўнасць ацэначнай інфармацыі ў тэксце:
— адкрытае меркаванне: на мой погляд здаецца… падобна... я лічу ...
— схаванае меркаванне: гэта значыць... усе гэта разумеюць... відавочна...
— выкарыстанне якасных прыметнікаў таксама сведчыць аб ацэначнай інфармацыі ў тэксце: стары-малады, сумленны-несумленны, карысны-шкодны

# 3 ФАКТЫ І МЕРКАВАННІ Ў МЕДЫЯ

| РЭПАРТАЖ | ПУБЛІЦЫСТЫКА |
|---|---|
| Жанр пазбаўлены эмоцый, які сцісла асвятляе бягучыя падзеі | Жанр, накіраваны на кантакт з чытачом ці гледачом |
| Што? Дзе? Калі? | Чаму? Як? Навошта? |
| Факты, факты, факты | Факты, погляды, каментарыі, аргументы, высновы |

# 4 ПРЫМЕТЫ ЯКАСНАГА МЕДЫЯКАНТЭНТУ:

— баланс меркаванняў пра падзею (не менш за два розныя пункты гледжання)
— дакладнасць і паўната перадачы фактаў і інфармацыі
— аддзяленне фактаў ад меркаванняў / каментарыяў
— абавязковая спасылка на крыніцу інфармацыі

## ПЫТАННІ ДЛЯ АНАЛІЗУ ПРЫЁМАЎ У РЭКЛАМЕ

### ВЫСВЕТЛІЦЕ, ЦІ ВЫКАРЫСТОЎВАЮЦЦА Ў РЭКЛАМЕ НАСТУПНЫЯ ПРЫЁМЫ:

1. Маніпуляванне эмоцыямі.
У роліку закранаюцца пачуцці і выклікаюцца станоўчыя эмоцыі (выкарыстанне вобразаў шчаслівай сям'і, закаханых людзей, музычнае афармленне, гумар і інш.)

2. Прыцягненне зорак шоу-бізнесу, спорту, кіно.
Стварэнне эфекту прывабнасці тавару ці паслугі, якую прапануе купіць любімы акцёр, «зорка» спорту і інш.

3. Паказ тавараў у найлепшым святле.
Тавары і паслугі паказаны як бездакорныя, лепшыя ў параўнанні з іншымі, дэманструюцца ў ідэальных сітуацыях.

4. З'яўленне ў кадры экспертаў.
Стварэнне эфекту аўтарытэту з дапамогай акцёраў ва ўніформе, якія прадстаўляюць спецыялістаў у асобных сферах.

5. Маніпуляванне лічбамі.
Выкарыстанне неакругленых лічбаў у цане тавару (напрыклад, 8,99 р.), пэўнага парадку лічбаў, паказ велічыні зніжкі).

### ЗРАБІЦЕ ВЫСНОВЫ:

1. Наколькі дакладна адлюстроўваюцца тавары і паслугі ў рэкламе?

2. Пра што замоўчвае або што наўмысна ўтойвае дадзеная рэклама?

## ПРАВЯРАЕМ НАЯЎНАСЦЬ СТЭРЭАТЫПАЎ У РЭКЛАМЕ

### 1 ХТО?

**У якой ролі выступае чалавек у рэкламе?**

- Эксперт?
- Прыватная асоба або прафесіянал?
- Хатняя гаспадыня або зорка спорту?

### 2 ДЗЕ?

**У якім атачэнні знаходзіцца чалавек, якога паказваюць у рэкламе?**

- Ён на працы, дома, на кухні, на канапе, у трэнажорнай зале?

### 3 ЯК?

**Як у рэкламе паказаны чалавек?**

- Ён актыўны або пасіўны?
- Ён творца падзей або ахвяра абставін?
- Ён усміхаецца або заклапочана хмурыцца?
- Як падаюцца яго імя і пасада: цалкам або скарочана?

### 4 ШТО?

**Што і як прапануе рэклама?**

- Якія характэрныя рысы можна вылучыць у тыповых мужчынскіх і жаночых вобразах у рэкламе?

## ЯК АНАЛІЗАВАЦЬ РЭКЛАМНЫ РОЛІК?



1. Апішыце свае эмоцыі, пачуцці, асацыяцыі, якія ўзнікаюць у час прагляду роліка.

2. Звярніце ўвагу на слоган роліка.
Як вы думаеце, чаму ён менавіта такі?
Які сэнс у яго закладваецца?

3. Звярніце ўвагу на сюжэт.
Дзе разгортваецца дзеянне? Якія дзеянні ўхваляе ролік?

4. Звярніце ўвагу на музычны фон.
Які настрой ствараецца?

5. Звярніце ўвагу на дзеючых асоб.
Хто з’яўляецца героямі роліка? Што яны робяць? З якім настроем?

6. Што дэманструюць у роліку фізічна прывабныя людзі,
а што — непрывабныя?

7. Як выглядаюць у роліку мужчыны і жанчыны, дзеці, пажылыя людзі? Чаму?

8. Якія яшчэ заканамернасці можна прасачыць?

## ПАМЯТКА ДЛЯ АНАЛІЗУ ФАТАГРАФІІ

1. Апішыце асоб, якіх вы бачыце на фота, а таксама іх дзеянні і / або аб'екты на здымку.
2. Як згрупаваныя людзі і / або аб'екты? Апішыце, што вы бачыце на заднім плане, на пярэднім плане, у цэнтры, злева і справа на фатаграфіі.
3. Што, на вашу думку, адбываецца на гэтым фота?
4. Хто гэтыя людзі? Чым яны займаюцца? Якія гэта аб'екты?
5. Калі, на вашу думку, быў зроблены здымак (год, перыяд, падзеі).
6. Ці ёсць на самім фота тэкст: плакаты, рэклама, надпісы? Ці ёсць подпіс на абароце фота? Пра што ён?
7. Гэта пастановачнае фота? Людзі пазіравалі перад фотакамерай?
8. Чаму менавіта ў гэтым месцы і менавіта ў гэты час з'явіўся чалавек з фотаапаратам?
9. На якія пытанні фатаграфія не можа адказаць? Якая інфармацыя адсутнічае?

## ПАМЯТКА ДЛЯ РАБОТЫ З ПОСТАРАМ ФІЛЬМА

1. Ці дае постар разуменне жанру кінафільма? Які гэта жанр?
2. Якімі сродкамі перадаецца галоўная ідэя (меседж) фільма?
3. Ці ёсць на постары слоган? Якія малюнкі выкарыстоўваюцца?
4. Ці знаёміць постар з галоўнымі героямі, акцёрамі?
5. Як зацікаўлена глядацкая аўдыторыя?

### АБАВЯЗКОВАЯ І ДАДАТКОВАЯ ІНФАРМАЦЫЯ НА ПОСТАРЫ:

- назва кінастужкі
- імя рэжысёра і назва студыі-вытворцы
- дата прэм'еры
- ці ёсць узроставыя абмежаванні
- прызы і ўзнагароды

## ТЭХНІКІ МАНІПУЛЯЦЫЙ

1. Гульня на эмоцыях
2. «Прычапны вагон» (Рабі, як усе!)
3. Псеўданавуковасць
4. Сведчанні (Экспертная ацэнка)
5. Паўторы
6. Негатыў пра суперніка
7. Паўпраўда (адбор фактаў, экспертаў)
8. «Аўтарытэтнае» меркаванне.

## ПЫТАННІ ДЛЯ АНАЛІЗУ МЕДЫЯПРОФІЛЮ ПЕРСОНЫ

1. **У якіх сацыяльных сетках ёсць уліковы запіс (акаўнт)?**

2. **Ці выкарыстоўваецца асабістае фота ў медыяпрофілі?**
   **Якая асабістая інфармацыя з'яўляецца агульнадаступнай?**

3. **Як часта выкарыстоўваецца Сетка?**

4. **Якія фатаграфіі пераважаюць у стужцы:**
   — з адпачынку, падарожжаў, сямейных свят, значных падзей
   — сэлфі
   — аб прафесійнай дзейнасці, вучобе

5. **Хто бачыць паведамленні?**
   **Для якой аўдыторыі ствараюцца паведамленні, выкладваюцца пасты?**
   — для ўсіх без абмежавання доступу
   — для сяброў сяброў
   — толькі для сяброў

6. **Аб чым часцей за ўсё пасты, публікацыі:**
   — дзеліцца карыснай інфармацыяй, уласнымі назіраннямі, вопытам калег і інш.
   — піша пра сябе, дзеліцца лайфхакамі, тэстамі, публікуе віншаванні

7. **Зрабіце выснову, для якіх мэт створаны акаўнт**

## ПАМЯТКА ДЛЯ РАБОТЫ З ФАТАГРАФІЯЙ ПОМНІКА І МЕМАРЫЯЛА

### 1 УВАЖЛІВА РАЗГЛЕДЗЬЦЕ ФАТАГРАФІЮ ПОМНІКА І АДКАЖЫЦЕ НА НАСТУПНЫЯ ПЫТАННІ:

- Як вы лічыце, каму прысвечаны гэты помнік? Што нам гавораць элементы, сімвалы, дэталі?
- Якую гісторыю распавядае помнік?
- Хто і пра што тут нагадвае?
- Якія каштоўнасці нясе помнік? Гэта адпавядае вашым каштоўнасцям?
- Якая функцыя помніка ў публічнай прасторы?
- Прапануйце назву для гэтага помніка і абгрунтуйце яе.
- Калі б вы былі мэрам, вы б дазволілі паставіць гэты помнік?

### 2 ЗНАЙДЗІЦЕ ІНФАРМАЦЫЮ ПРА ПОМНІК (ЯК НАЗЫВАЕЦЦА, КАМУ ПРЫСВЕЧАНЫ, ХТО З'ЯЎЛЯЎСЯ ІНІЦЫЯТАРАМ МЕМАРЫЯЛІЗАЦЫІ, ДАТА АДКРЫЦЦЯ). ПАРАЎНАЙЦЕ ГЭТУ ІНФАРМАЦЫЮ З УЛАСНЫМІ МЕРКАВАННЯМІ.

### 3 КАЛІ ПОМНІК УСТАЛЯВАНЫ НЯДАЎНА, ЗНАЙДЗІЦЕ Ў ІНТЭРНЭЦЕ ТРЫ ПУБЛІКАЦЫІ З ГЭТАЙ ФАТАГРАФІЯЙ АБ АДКРЫЦЦІ ПОМНІКА. АДКАЖЫЦЕ НА НАСТУПНЫЯ ПЫТАННІ:

- Якія загалоўкі выкарыстоўваюцца ў розных медыя?
- Ці адрозніваюцца меседжы (асноўныя пасылы, ідэі) публікацый? Сфармулюйце іх.
- Каму належаць медыя? На якую аўдыторыю яны арыентаваныя?

## АНАЛІЗ ВЫПУСКУ НАВІН (ІНСТРУКЦЫЯ)

**1** **Дата выпуску навін __________**

**2** **Выпуск навін (назва канала, перадачы) _________**

**3** **Вядучыя (прозвішчы рэпарцёраў)______________**

**4** **Колькасць сюжэтаў агульная ______, пра дарослых _____, пра моладзь і дзяцей______.**
**Ці адпавядае гэта складу грамадства?**

**5** **Коратка апішыце навіну, якую можна ахарактарызаваць як тыпова «дзіцячую», «падлеткавую» ці «дарослую» ___________.**

**6** **Выберыце асобную навіну з выпуску і адкажыце на пытанні:**
— Ці прысутнічаў у ёй эксперт? (так, не)
— Калі так, то ўкажыце, хто выступіў у ролі эксперта - мужчына/жанчына, сталы/малады, нацыянальнасць ________?
— Ці прысутнічае ў навіне ахвяра падзеі? (так, не)
— Калі так, то ўкажыце, хто выступіў у ролі ахвяры - мужчына/жанчына, сталы/малады, нацыянальнасць ________?
— Ці прысутнічае ў навіне прыгнятальнік? (так, не)
— Калі так, то ўкажыце, хто выступіў у ролі прыгнятальніка — мужчына/жанчына, сталы/малады, нацыянальнасць ________?

**7** **Зрабіце высновы пра гендарныя, узроставыя і нацыянальныя стэрэатыпы ў навінах:**

## ФОРМА АЦЭНЬВАННЯ ІНТЭРНЭТ-РЭСУРСАЎ

**Інструкцыя:** Карыстайцеся спісам пытанняў, які прыведзены ніжэй, і лічыце балы, каб вызначыць надзейнасць сайта/артыкула. Магчыма, некаторыя пункты трэба будзе змяніць з улікам розных мэт выкарыстання сайтаў.
**21-26 балаў – вялікая верагоднасць, што рэсурс карысны, 12-20 – магчыма, гэта карысны рэсурс, аднак трэба ўважліва правяраць інфармацыю, 0-11 – хутчэй за ўсё, гэта ненадзейны рэсурс.**

| ТАК | ЧАСТКОВА | НЕ | | ЗАЎВАГІ |
|---|---|---|---|---|
| 2 | 1 | 0 | 1. Ці адпавядае назва сайта зместу? Ці дастаткова прапісана мэта сайта? | На сайце павінны быць - раздзел (Пра нас, Аб праекце, Аўтары і т. п) - або падзагаловак назвы сайта, - або інфармацыя на першай (дамашняй) старонцы. У артыкуле можа быць прапісана стаўленне аўтара да праблемы. |
| 2 | 1 | 0 | 2. Ці зразумела, каму належыць сайт? (Арганізацыя? Фізічная асоба? Хто аўтары сайта? (Калі вядомая арганізацыя — 2, асоба — 1, невядома — 0) | |
| 2 | 1 | 0 | 3. Ці можна сцвярджаць, што гэты сайт аб'ектыўны, бесстаронні, што ён не прасоўвае інтарэсы камерцыйных, палітычных, сацыяльных праектаў? Ці вы бачыце праявы перадузятасці? | |
| 2 | 1 | 0 | 4. Калі адказ на пытанне 3 "Часткова" ці "Не", то ці спрабуюць аўтары прадстаўляць інфармацыю збалансавана, непрадузята: выкарыстоўваюць неманіпулятыўныя, эмацыйна нейтральныя словы, асвятляюць розныя пункты гледжання? | |
| 2 | 1 | 0 | 5. Ці дае сайт унікальную, карысную інфармацыю, да якой няма шырокага доступу, якой няма на іншых вядомых рэсурсах? | |
| 2 | 1 | 0 | 6. Ці мае сайт спасылкі на іншыя надзейныя крыніцы для пацвярджэння дадзеных/ інфармацыі/ фактаў? Ці аформлены гэтыя спасылкі належным чынам? | |
| 2 | 1 | 0 | 7. Ці маюцца дадзеныя аб прафесійных дасягненнях аўтараў сайта/артыкула? Ці можна ім давяраць? Ці маюць аўтары адпаведную спецыяльнасць і дастатковую кампетэнтнасць у тэме? | Праверыць: у пошукавіку Google уставіць імя аўтара і галоўнае слова па тэме артыкула. |
| 2 | 1 | 0 | 8. Ці з'яўляецца арганізацыя (аўтары) дастаткова аўтарытэтнымі? Ці маюць іншыя сайты паважаных і прафесійных арганізацый спасылкі на гэты рэсурс? | Для высвятлення: а) у пошукавіку Google link: і адрас сайта. Напрыклад: link: www.website.com б) загрузіць https://alexa.com уставіць адрас сайта ў вакно пошука і паглядзець, колькі сайтаў спасылаецца на гэты сайт. |
| 2 | 1 | 0 | 9. Ці абнаўляецца гэты сайт? Як часта? Ці не састарэлыя дадзеныя ён прадстаўляе? | Для высвятлення: а) напісана на сайце ўнізе; б) загрузіць https://archive.org, праверыць дату стварэння, абнаўленні, зафіксаваныя праектам. |
| 2 | 1 | 0 | 10. На сайце/артыкуле адсутнічае відавочная рэклама тавару / ідэі/ паслугі? Дакладна аддзяляюцца факты ад іх інтэрпрэтацыі? | |
| 2 | 1 | 0 | 11. Ці дакладная, граматная, ветлівая мова сайта? | |
| 2 | 1 | 0 | 12. Ці з'яўляюцца на сайце выявы / дыяграмы аўтэнтычнымі (зробленымі аўтарамі сайта / артыкула), а не пазычанымі з іншых крыніц? Ці ёсць спасылкі на тыя крыніцы, з якіх узяты выявы? | Для высвятлення: а) Падвесці курсор да выявы і пры націснутай правай клавішы мышы "Шукаць выявы Google" знайсці найстарэйшую выяву. б) Уставіць у браўзер (Chrome, Mozilla Firefox) дадаткі для пошуку выяў (Хто скраў мае малюнкі? Who stoles my picture?) |
| 2 | 1 | 0 | 13. Ці з'яўляецца змест сайта лагічным, зразумелым для мэтавай групы? | |

**Заўвага.** Сур'ёзныя навуковыя артыкулы і сайты звычайна закрытыя для масавых наведванняў, маюць падпіску для прафесіяналаў. Мовай навукі лічыцца англійская мова.

## КЛЮЧАВЫЯ ПЫТАННІ ДЛЯ АНАЛІЗУ МЕДЫЯТЭКСТУ

| | | |
|---|---|---|
| **АЎТАРСТВА & АЎДЫТОРЫЯ** | **АЎТАРЫ** | Хто гэта зрабіў? |
| | **МЭТЫ** | Навошта гэта было зроблена?<br>Што хацелі ад мяне аўтары?<br>Каму адрасавана пасланне і чаму вы так думаеце? |
| | **ЭКАНОМІКА** | Хто за гэта заплаціў? Каму належыць выданне? |
| | **УЗДЗЕЯННЕ** | Хто можа атрымаць карысць ад гэтага паслання?<br>Каму можа быць нанесена шкода?<br>Ці карыснае гэта паведамленне для мяне і людзей, падобных да мяне?<br>Што апавядальнік хоча, каб я запомніў? |
| | **АДКАЗ** | Што я магу зрабіць у адказ на гэта паведамленне? |
| **ПАВЕДАМЛЕННЕ & ЗНАЧЭННЕ** | **ЗМЕСТ** | Пра што гэта паведамленне (і што прымушае мяне так думаць)?<br>Якіх высноў ад мяне чакалі?<br>Якія ідэі, каштоўнасці, інфармацыя і/ці пункты гледжання даносяцца ці навязваюцца?<br>Што важнае засталося недасказаным? |
| | **МЕТАДЫ** | Якія тэхнікі данясення інфармацыі выкарыстоўваюцца і чаму?<br>Як гэтыя тэхнікі суадносяцца з мэтай? |
| | **ІНТЭР-ПРЭТАЦЫЯ** | Ці могуць розныя людзі зразумець гэта паведамленне па-рознаму?<br>Як я зразумеў (-ла) гэта паведамленне і што я даведаў(-ла)ся пра сябе, зыходзячы з маёй рэакцыі або тлумачэння? |
| **РЭПРЭЗЕНТАТЫЎНАСЦЬ & РЭАЛЬНАСЦЬ** | **КАНТЭКСТ** | Калі паведамленне было падрыхтавана? Пры якіх абставінах?<br>Дзе і як распаўсюджана? |
| | **ДАВЕР** | Гэта факт, чыёсьці меркаванне, інтэрпрэтацыя ці нешта яшчэ?<br>Наколькі праўдападобна гэта (і чаму вы так думаеце)?<br>Якая крыніца інфармацыі, ідэй або сцвярджэнняў?<br>Ці можна давяраць гэтай крыніцы? |